ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



«Прыпраўляю страве ўсмешкай»



Што для моладзі сям'я?



З гісторыі Галоўпаштамта

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ЧАЦВЕР №207 (28571)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Перад зімовымі вятрамі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі Аршанскага зелянгаса пілуюць аварыйныя дрэвы на падворках вяскоўцаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ШУНЕВІЧ,**
**міністр унутраных спраў:**

*«Мяняецца вельмі многае ў заканадаўстве па пытаннях правядзення масавых мерапрыемстваў, змяняецца асноўны прынцып правядзення масавых мерапрыемстваў. У Беларусі ўводзіцца прынцып, які адпавядае агульнасусветнай практыцы, — гэта прыняцце паведамляльнага парадку правядзення масавых мерапрыемстваў у пастаянных месцах, якія вызначаны для гэтага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Гэта значыць любая арганізацыя, чалавек можа прыйсці, заявіць пра сваё жаданне правесці масавае мерапрыемства ва ўстаноўленым месцы, і на гэта згода ўлад не патрабуецца. Калі правядзенне масавага мерапрыемства запланавана ў неўстаноўленым месцы, у такім выпадку неабходна будзе атрыманне згоды мясцовых улад».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9557 | ▲ |
| Еўра | 2,3011 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0730 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Працяг тэмы

# СПРЭЧНАЕ ПАДМІКОЛЛЕ

**У Магілёве працягваецца супрацьстаянне наконт будучага парку адпачынку**

**«Звязда» ўжо некалькі разоў пісала пра тое, што адбываецца вакол гістарычнага месца ў цэнтры Магілёва, дзе сёння ствараецца парк. Менавіта гэта тэрыторыя выклікала шмат пытанняў пры распрацоўцы Генеральнага плана горада.**

Спачатку магіляўчане катэгарычна выказаліся супраць будаўніцтва там гандлёва-забаўляльнага цэнтра і фестывальнай пляцоўкі, потым дабіваліся, каб іх прапановы знайшлі адлюстраванне ў новым варыянце гістарычна-планіровачнага рашэння. Пры Магілёўскім гарвыканкаме на пачатку года адбыўся круглы стол, ініцыяваны Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. Здаецца, усе пытанні былі вырашаны, бакі знайшлі кампраміснае рашэнне. Гандлёва-забаўляльны цэнтр і фестывальная пляцоўка зніклі з «карты» дзеянняў. Замест цэнтра вырашана было пабудаваць лесвіцу з ратондамі і каскадам фантанаў. А каб пазбегнуць спрэчак, з падачы міністэрства была створана рабочая група з актывістамі ад грамадскасці, якая павінна дзейнічаць поруч з распрацоўшчыкамі і мясцовымі ўладамі на карысць агульнай справы. Але атмасфера вакол парку зноў абвастраецца, жыхары пішуць гнеўныя лісты ў розныя інстанцыі, адказы не заўсёды іх задавальняюць. Каб зняць напружанне і агучыць праблемныя пытанні па канцэпцыі развіцця парку адпачынку «Падміколле», Магілёўскі гарвыканкам ініцыяваў прэс-канферэнцыю. Удзел у размове прынялі намеснікі старшыні Магілёўскага гарвыканкама Ала Галушка і Аляксандр Вяракса, кіраўнікі камунальных службаў горада.

## Дрэвам выдадуць пашпарты

Падміколле — месца складанае, з аднаго боку — прыватны сектар, з другога — манастырскія пабудовы і дзясяткі гектараў неасвоенай тэрыторыі. Так склалася толькі ў ХХ стагоддзі пасля вайны, да гэтага жыццё тут віравала. За гады запусцення на закінутых гектарах утварылася сапраўднае царства баршчэўніку і хмызняку. Зараз усё мяняецца. Але вельмі актыўныя будаўнічыя работы насцярожваюць гараджан. Ім здаецца, што пад занадта вялікай колькасцю бетонных сцяжынак знікаюць гістарычныя падмуркі, знішчаецца каранёвая сістэма дрэў каштоўных парод. Наколькі гэтыя асцярогі апраўданыя?

СТАР. 4

■ Спадчына

# З КАРАЛЕЎСКІМ РАЗМАХАМ

Гродзенскаму Старому замку будзе вернуты выгляд часоў Стафана Баторыя

**Рэстаўрацыя былога палаца пачалася. Згодна з праектам, будынак аднаго з самых знакамітых гістарычных помнікаў краіны павінен адпавядаць абліччу XVI стагоддзя, хоць і пабудаваны значна раней. Яшчэ ў XII стагоддзі замак стаў галоўнай рэзідэнцыяй правіцеля ВКЛ Вітаўта. Кароль Рэчы Паспалітай Стафан Баторый перабудаваў замак у стылі Рэнесансу.**

СТАР. 4



Рэканструкцыя Старога замка пачалася.

■ Блізкая ўлада

# БУДЗЕ СТВОРАНА АДЗІНАЯ БАЗА ЗВАРОТАЎ

## Наталля Качанава правяла прыём грамадзян у Першамайскім раёне сталіцы

**У Беларусі будзе сфарміравана адзіная база зваротаў грамадзян. Пра гэта паведаміла журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава, якая ўчора правяла прыём грамадзян у адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска.**


Фота БЕЛТА.

«Работа са зваротамі грамадзян вельмі важная для ўсіх органаў улады. Яна патрабуе ўдасканалення — заканадаўства аб зваротах грамадзян мае патрэбу ў некаторай дапрацоўцы, — лічыць Наталля Качанава. — Час не стаіць на месцы: з развіццём электронных тэхналогій людзі актыўна карыстаюцца інтэрнэтам, адпраўляюць электронныя звароты, задаюць пытанні, якія іх цікавяць, на сайтах дзяржорганаў».

Аляксандр Лукашэнка 24 кастрычніка на нарадзе з кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў наяўнасць праблемных момантаў у пытанні работы са зваротамі грамадзян. «Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову аб стварэнні адзінай базы зваротаў. Гэта дасць магчымасць бачыць «гісторыю» кожнага звароту, які паступіў у найвышэйшую інстанцыю, у тым ліку дзе і кім ён ужо разглядаўся (зварот не будзе накіроўвацца таму, хто па ім ужо даваў адказ), — растлумачыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Адзіная база даных будзе сфарміравана і ў мясцовых, і ў рэспубліканскіх органах улады». Гэта дазволіць мець поўную інфармацыю па кожным звароце.

«Акрамя таго, пастаўлена задача — і мы будзем яе рэалізоўваць з прыцягненнем Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра, прэс-цэнтра — адсочваць сітуацыю па сур'ёзных праблемах, якія хвалююць грамадства і якія ўплываюць на настрой людзей. Гаворка ідзе пра публікацыі ў газетах, пра тэлесюжэты і інтэрнэт — інфармацыю будуць штодня абагульняць і падстаўляць у Адміністрацыю Прэзідэнта для прыняцця аператыўных рашэнняў», — сказала Наталля Качанава.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# З УЛІКАМ ГРАМАДСКІХ ПАТРЭБ

## У ніжняй палаце разгледзелі шэраг законапраектаў

**Учарашняе пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў мела сацыяльны кірунак. Дэпутаты разгледзелі змены ў Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях, у некаторых законах, што датычацца правядзення масавых мерапрыемстваў, а таксама прынялі пастанаўленне, якое абараняе правы работнікаў прадпрыемстваў Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Быў ратыфікаваны таксама Дагавор аб Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза (пра гэта чытайце ў найбліжэйшым выпуску дадатку «СЕ»), у другім чытанні дэпутаты прынялі змены і дапаўненні ў закон «Аб ветэранах».**

### Без абмежаванняў на алкаголь

**Леанід КАЧЫНА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы,** выступіў судакладчыкам па законапраекце, што ўносіць змяненні і дапаўненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

— Праект закона рыхтаваўся ў адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2016 года №5 "Аб перамяшчэнні, захаванні і продажы фізічнымі асобамі алкагольных напояў", — паведаміў дэпутат. — Дакумент прадугледжвае вызваленне фізічных асоб ад адміністрацыйнай адказнасці за захаванне алкагольных прадуктаў у любой колькасці, прычым як маркіраваных, так і немаркіраваных акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь або спецыяльнымі маркамі. Таксама знімаюцца абмежаванні па перамяшчэнні фізічнымі асобамі алкагольнай прадукцыі, маркіраванай акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, або спецыяльнымі маркамі па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Разам з тым дадзены праект узмацняе адказнасць фізічных асоб за перамяшчэнне алкагольных прадуктаў, немаркіраваных ва ўстаноўленым парадку акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, па тэрыторыі нашай дзяржавы.

### Лібералізм па максімуме

**Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў,** прадставіў праект закона, што ўносіць змяненні і дапаўненні ў некаторыя нарматыўныя акты па пытаннях правядзення масавых мерапрыемстваў.

Тэма дзедаўшчыны таксама зараз вельмі актыўна абмяркоўваецца ў нашым грамадстве — на самых розных узроўнях. Адказваючы на пытанне, як ён увогуле ставіцца да такой з'явы ў арміі, Ігар Шуневіч заявіў:

— Я тры гады праходзіў службу ў ваенна-марскім флоце і ведаю, што парадак у воінскіх часцях, на караблях забяспечваюць не толькі старшыя камандзіры, але і малодшыя камандзіры. Зразумела, што ўсё залежыць ад іх у пытанні дзедаўшчыны. Парадак, які павінен быць у кубрыку або ў казарме, часам патрабуе жорсткага падпарадкавання. А прыніжэнне, рознага роду ўздзеянне, у тым ліку псіхалагічнае, фізічнае на маладога байца, — гэта ганьба для ўсіх.

### Скарыстаць магчымасці

**Жанна СТАЦІЎКА, член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях,** выступіла судакладчыкам па праекце пастанаўлення Палаты прадстаўнікоў, які датычыцца Дэкрэта №6 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

— Дакумент накіраваны на ўдасканаленне заканадаўства ў сферы прафесійных саюзаў і абароны правоў работнікаў, што працуюць на прадпрыемствах Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Гэта тэрыторыя з вялікімі магчымасцямі, дзе сёння будуюцца інавацыйныя высокатэхналагічныя вытворчасці і плануецца стварэнне больш як 120 тысяч працоўных месцаў. Карэкціроўка Дэкрэта №6 дазваляе ўмацаваць прававыя гарантыі працоўных адносін работнікаў прадпрыемстваў «Вялікага каменя».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# БАЛАНС ІНТЭГРАЦЫЙ

**Міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір МАКЕЙ даў інтэрв'ю Financial Times. Кіраўнік дыпламатычнага ведамства адказаў на шэраг пытанняў. Прапануем азнаёміцца з ключавымі тэзісамі матэрыялу.**

### Пра палітычную незалежнасць

«Мы не хочам залежаць ад каго б там ні было — няхай гэта будзе Вашынгтон, Брусель ці Масква. Мы ўсяго толькі хочам праводзіць сапраўды незалежную палітыку. У гэтым кантэксце нашым інтарэсам адпавядае дыверсіфікацыя гандлёва-эканамічных адносін, і ЕС іграе важную ролю ў нашых планах. І гэта, яшчэ раз падкрэслю, не толькі ў інтарэсах Беларусі, але і ЕС».

### Пра бязвізавы рэжым

«Гэта было зроблена намі ў аднабаковым парадку, хоць мы зараз і абмяркоўваем з ЕС заключэнне двух пагадненняў: аб рэадмісіі і аб спрашчэнні візавых працэдур. Наша ініцыятыва заклікана палегчыць дзелавыя кантакты паміж Беларуссю і ЕС, спрыяць развіццю турызму. І гэта яшчэ не мяжа: мы маем намер павялічыць тэрмін знаходжання ў Беларусі без віз да 10 ці нават 30 дзён. Але ісці да гэтага мы будзем паступова, крок за крокам. Да канца бягучага года мы прааналізуем сітуацыю ў гэтай сферы і ўнясём канкрэтныя прапановы кіраўніку дзяржавы, якія датычацца пашырэння бязвізавага рэжыму».

### Пра адносіны з Расіяй і ЕС

«Мы не выступаем праваднікам пазіцыі Вашынгтона, Масквы ці Бруселя. Мы прадстаўляем пазіцыю Мінска. Мы хацелі б знайсці пазітыўны баланс у адносінах з Расіяй і нашымі еўрапейскімі партнёрамі. Нам бы не хацелася, каб у нашым рэгіёне ўзнікалі новыя раздзяляльныя лініі... Вось чаму наш Прэзідэнт некалькі гадоў таму абвясціў ідэю так званай «інтэграцыі інтэграцый». Што гэта азначае? Гэта азначае, што сёння нам неабходна наладзіць нармальнае супрацоўніцтва не толькі паміж дзяржавамі, але таксама і паміж інтэграцыйнымі ўтварэннямі, структурамі, якія існуюць у розных рэгіёнах свету. У Еўропе гэта, з аднаго боку, Еўрапейскі саюз, з другога — Еўразійскі эканамічны саюз».

* * *

Financial Times — міжнародная дзелавая газета, што выдаецца на англійскай мове ў дзясятках гарадоў свету. Спецыялізуецца на публікацыі і аналізе навін сфер фінансаў і бізнесу. Галаўны офіс рэдакцыі знаходзіцца ў Лондане.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**27 кастрычніка 2017 г. у 15.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

**ПАВЕДАМЛЕННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ**

ГОД НАВУКІ 2017

24 кастрычніка 2017 г. рашэннем Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі зарэгістраваны кандыдатамі ў члены НАН Беларусі, выбары якіх адбудуцца 16 лістапада 2017 г., на вакансіі:

**Правадзейных членаў (акадэмікаў) НАН Беларусі:**

АДДЗЯЛЕННЕ ФІЗІКІ, МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

па спецыяльнасці «Інфармацыйныя тэхналогіі»: Белавус А. І., Гурскі Л. І., Тузікаў А. В., Харын Ю. С.;

па спецыяльнасці «Оптыка»: Белы У. М., Ціхаміраў С. А.

АДДЗЯЛЕННЕ ФІЗІКА-ТЭХНІЧНЫХ НАВУК

па спецыяльнасці «Матэрыялазнаўства»: Асташынскі В. М., Белы А. У., Ільюшчанка А. Ф., Панцялеенка Ф. І., Пясецкі С. С., Піліпенка У. А., Рубанік В. В., Федасюк В. М., Шэлег В. К.

АДДЗЯЛЕННЕ ХІМІІ І НАВУК АБ ЗЯМЛІ

па спецыяльнасці «Біяарганічная хімія»: Усанаў С. А.

АДДЗЯЛЕННЕ БІЯЛАГІЧНЫХ НАВУК

па спецыяльнасці «Геноміка раслін»: Кільчэўскі А. У.;

па спецыяльнасці «Мікробная біятэхналогія»: Каламіец Э. І.

АДДЗЯЛЕННЕ МЕДЫЦЫНСКІХ НАВУК

па спецыяльнасці «Нейрафізіялогія»: Вісмонт Ф. І., Кульчыцкі У. А.;

па спецыяльнасці «Траўматалогія і артапедыя»: Бялецкі А. В.

АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ

па спецыяльнасці «Беларуская мова»: Лукашанец А. А.;

па спецыяльнасці «Гісторыя Беларусі»: Бабкоў У. А., Каваленя А. А.

АДДЗЯЛЕННЕ АГРАРНЫХ НАВУК

па спецыяльнасці «Аграпрамысловыя тэхналогіі»: Голуб І. А., Казакевіч П. П., Лоўкіс З. В., Песціс В. К., Прывалаў Ф. І.

**Членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі:**

АДДЗЯЛЕННЕ ФІЗІКІ, МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

па спецыяльнасці «Вылічальная матэматыка»: Матус П. П., Шчарбакоў С. С.;

па спецыяльнасці «Інфармацыйныя тэхналогіі»: Жураўкоў М. А., Іванюк А. А., Кавалёў М. Я.;

па спецыяльнасці «Квантавая оптыка»: Гурскі А. Л., Максіменка С. А., Магілеўцаў Д. С.;

па спецыяльнасці «Лазерныя тэхналогіі»: Куляшоў М. В., Тарасенка М. У., Танін Л. В.

АДДЗЯЛЕННЕ ФІЗІКА-ТЭХНІЧНЫХ НАВУК

па спецыяльнасці «Абаронныя тэхналогіі»: Бузін М. Я., Грабчыкаў С. С., Лісейчыкаў М. І., Пяцюшык Я. Я.;

па спецыяльнасці «Матэрыялазнаўства»: Валочка А. Ц., Гапоненка М. В., Ермакоў С. Ф., Канстанцінаў В. М., Коржык М. В., Кукарэка У. А., Леановіч С. М., Лаўшэнка Р. Ф., Углоў У. В.;

па спецыяльнасці «Машынабудаванне»: Басінюк У. Л., Бахановіч А. Г., Байкоў У. П., Васілевіч Ю. У., Дэвойна А. Г., Залескі В. Г., Качанаў І. У., Ксенафонтаў М. А., Таміла В. А., Хейфец М. Л.;

па спецыяльнасці «Прыборабудаванне»: Авакаў С. М., Грыгор'еў А. Я., Крэнь А. П., Малярэвіч А. М., Сандамірскі С. Р., Серанкоў П. С.;

па спецыяльнасці «Энергаэфектыўныя тэхналогіі»: Грынчук П. С., Дабрэга К. В., Жураўскі Г. І., Куўшынаў В. І., Піліпенка У. М., Раманюк У. Н., Седнін У. А.

АДДЗЯЛЕННЕ ХІМІІ І НАВУК АБ ЗЯМЛІ

па спецыяльнасці «Біяарганічная хімія»: Жабінскі У. М., Кісель М. А., Ліцьвінка Н. М.;

па спецыяльнасці «Геалогія»: Багдасараў М. А.;

па спецыяльнасці «Геаэкалогія»: Войтаў І. В., Какарэка С. В.;

па спецыяльнасці «Калоідная хімія»: Арцем'еў М. В., Дармешкін А. Б., Панькоў У. В., Шаўчук В. У.

АДДЗЯЛЕННЕ БІЯЛАГІЧНЫХ НАВУК

па спецыяльнасці «Біяфізіка»: Верасаў В. Г., Кабашнікава Л. Ф.;

па спецыяльнасці «Генетыка»: Дубавец Н. І., Ціток М. А., Ярмішын А. П.;

па спецыяльнасці «Лесазнаўства»: Усеня У. У.;

па спецыяльнасці «Экалогія раслін»: Дземідчык В. В., Прохараў В. М., Торчык У. І.

АДДЗЯЛЕННЕ МЕДЫЦЫНСКІХ НАВУК

па спецыяльнасці «Лазерная тэрапія»: Імшэнецкая Т. А., Сердзючэнка М. С.;

па спецыяльнасці «Неадкладная кардыялогія»: Булгак А. Р., Міцькоўская Н. П.;

па спецыяльнасці «Трансплантацыя органаў»: Румо А. А.;

па спецыяльнасці «Фтызіяпульманалогія»: Гурэвіч Г. Л.;

па спецыяльнасці «Хірургія»: Богдан В. Г., Герасіменка М. А., Прохараў А. В., Сакалоўскі А. А., Шанько Ю. Г., Янушка В. А.

АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ

па спецыяльнасці «Археалогія»: Ляўко В. М., Лысенка П. Ф., Марзалюк І. А.;

па спецыяльнасці «Культуралогія»: Адула Т. І., Жук В. І., Ляўко А. І., Мажэйка М. А., Саверчанка І. В., Салееў В. А., Сардараў А. С., Старжынскі В. П.;

па спецыяльнасці «Педагогіка»: Валадзько У. Ф., Ганчаронак І. І., Сендзер Г. М., Снапкоўская С. В.;

па спецыяльнасці «Права»: Васілевіч Р. А.

АДДЗЯЛЕННЕ АГРАРНЫХ НАВУК

па спецыяльнасці «Агульнае земляробства»: Кухарчык Н. В., Пірагоўская Г. У.;

па спецыяльнасці «Прамысловыя тэхналогіі ў жывёлагадоўлі»: Красочка П. А., Радчыкаў В. Ф., Цімошанка У. М., Якоўчык М. С.;

па спецыяльнасці «Селекцыя і развядзенне сельскагаспадарчых жывёл»: Шэйко Р. І.;

па спецыяльнасці «Селекцыя і насенняводства сельскагаспадарчых раслін»: Казлоўская З. А., Скарына У. У., Урбан Э. П.

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
У. Р. Гусакоў

Галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
А. У. Кільчэўскі

УНП 101078490

# НАБЛІЖАЕЦЦА ЧАС ЯСКРАВЫХ ПЕРАМОГ

**Некалькі сотняў работ паступіла на конкурс па стварэнні талісмана Еўрагульняў**

**Аб гэтым паведаміў міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА на тэму «Беларусь рыхтуецца да Еўрагульняў-2019». На думку міністра, з тэхнічнага пункту гледжання эскізы выкананы на высокім узроўні, аднак «хацелася б больш крэатыву».**



Фота Белта.

— Малюнкаў пакуль некалькі сотняў. Але эскізы, на мой погляд, не адлюстроўваюць у поўнай меры тыя ідэі, якія закладзены ў палажэнні, — лічыць Аляксандр Карлюкевіч.

Большасць аўтараў работ — навучэнцы школ і ўстаноў з мастацкім ухілам. Аўтар найлепшага эскіза атрымае пакет білетаў на самыя відовішчныя мерапрыемствы спаборніцтваў — уключаючы цырымоніі адкрыцця і закрыцця, заявіў **намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ.** Прадугледжаны і іншыя прызы — гэта камплект экіпіроўкі спартсменаў нацыянальнай зборнай Беларусі, а таксама сам талісман, выраблены на аснове эскіза аўтара.

Найлепшую работу выберуць прафесіяналы: арганізатары конкурсу супрацоўнічаюць з Акадэміяй мастацтваў і яе рэктарам Міхаілам Баразной. Конкурс плануецца завяршыць 15 лістапада, аднак калі ўзнікне неабходнасць, то тэрмін будзе працягнуты. Важна, каб талісман адпавядаў слогану «Bright year, bright you» («Яркі год, яркі ты»), руская варыяцыя лозунга — «Время ярких побед» і беларуская — «Час яскравых перамог».

Дарэчы, першыя білборды са слоганам II Еўрапейскіх гульняў ужо з'явіліся ў сталіцы ўздоўж праспекта Пераможцаў. «Пасля іх устаноўкі было прынята рашэнне дадаць у афармленне рэкламы Гульняў-2019 яшчэ больш фарбаў. Паступова горад будзе пераўтварацца», — дадаў Анатоль Котаў. Маляўніча афармяць гарадскі і пасажырскі транспарт.

Інфармацыйная кампанія дапоўніцца і афіцыйным сайтам спаборніцтваў, які будзе запушчаны ў першыя дні лістапада на некалькіх мовах — англійскай, рускай і беларускай. «Што ж датычыцца работы з сацыяльнымі сеткамі, ужо ёсць групы, старонкі, на якіх размяшчаецца інфармацыя аб ходзе падрыхтоўкі да Еўрапейскіх гульняў. Гэта рэсурсы Белтэлерадыёкампаніі «Беларусь 1», «Беларусь 5», дзе дастатковая колькасць падпісчыкаў. Безумоўна, Еўрагульні будуць прадстаўлены ў розных сацыяльных сетках», — падкрэсліў Аляксандр Карлюкевіч.

Усяго на Еўрапейскіх гульнях чакаецца каля 30 тысяч турыстаў — такі прагноз зроблены на падставе вопыту чэмпіянату свету па хакеі і вопыту Баку. «Гэта лічба з вельмі вялікай агаворкай, паколькі Баку быў далёка, толькі авіязносіны туды былі дастаткова дарагімі. У нашым выпадку чакаецца значна больш турыстаў», — сказаў Анатоль Котаў.

Дарэчы, арганізатары Еўрапейскіх гульняў разглядаюць некалькі варыянтаў бязвізавага ўезду ў Мінск гасцей: бязвізавы рэжым для асоб, якія будуць прымаць удзел у Еўрагульнях, доступ у краіну па акрэдытацыі. Яшчэ адна магчымасць — бязвізавы ўезд у Мінск па білеце на спаборніцтвы. Паралельна абмяркоўваецца магчымасць павелічэння тэрміну бязвізавага знаходжання ў нашай краіне да 10 дзён.

Асвятленнем маштабнага мерапрыемства будзе займацца больш як тысяча прадстаўнікоў СМІ, расказаў міністр інфармацыі. Акрэдытацыя пачнецца за год да спаборніцтваў. Галоўны медыяцэнтр будзе размешчаны ў Футбольным манежы на праспекце Пераможцаў. Аляксандр Карлюкевіч дадаў, што канал «Еўраньюс», а таксама буйныя PR-агенцтвы Вялікабрытаніі, Германіі і Расіі выказалі гатоўнасць да асвятлення Еўрагульняў-2019, плануюцца перагаворы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■ Наўздагон

# ПАДВЯЛІ ВЫНІКІ

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр РАДЗЬКОЎ сустрэўся з удзельнікамі XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.**

Дэлегаты падзяліліся сваімі ўражаннямі ад удзелу ў мерапрыемствах фестывальнага тыдня. У працэсе сустрэчы ўсе члены грамадскага аб'яднання таксама абмеркавалі пытанні рэалізацыі і развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, патрыятызму і ідэалагічнага выхавання моладзі.

«На фестывалі была работа на працягу тыдня. Дэлегаты маглі ўбачыць, адчуць, абмеркаваць праблемы маладзёжнай палітыкі ў розных краінах ад блізкага да далёкага замежжа. Прычым гэтыя сістэмы вар'іраваліся і часам былі зусім не падобныя на беларускую, што вельмі каштоўна з пункту гледжання вопыту. Акрамя таго, гэта ўнікальны шанц адчуць праблемы сацыяльнага і эканамічнага характару, якія ўплываюць на маладзёжную палітыку. Мы сабраліся тут, каб гэта ўсё абмеркаваць», — адзначыў Аляксандр Радзькоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# НАЙЛЕПШЫ БОДЗІБІЛДАР — РАТАВАЛЬНІК

**Прапаршчык унутранай службы Ілья Лукавец, работнік пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС з Наваполацка, атрымаў узнагароду ў адной з намінацый на чэмпіянаце Расіі па бодзібілдзінгу і фітнесе ў Астрахані.**



getbig.tv

У спаборніцтвах удзельнічала каля 500 спартсменаў з розных рэгіёнаў суседняй краіны, а таксама прадстаўнікі Беларусі, Украіны, Ірана. Медалі разыгралі больш чым у 50 намінацыях.

У самай прэстыжнай — сярод мужчын-бодзібілдараў у вагавой катэгорыі звыш 100 кілаграмаў — перамогу святкаваў Ілья Лукавец. Ён стаў найлепшым і ў абсалютнай вагавой катэгорыі.

Ілья Лукавец — адзін з найлепшых беларускіх спартсменаў. Каля тыдня таму ён стаў абсалютным пераможцам у катэгорыі «бодзібілдзінг» на адкрытым Кубку Беларусі па бодзібілдзінгу і фітнесе ў Магілёве. У скарбонцы атлета — узнагароды віцэ-чэмпіёна Расіі, абсалютнага пераможцы Масквы і трэцяе месца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# «Зімовы» час скарэктаваў расклад руху цягнікоў

**У сувязі з пераходам ноччу з 28 на 29 кастрычніка ў краінах ЕС і Украіне на «зімовы» час Беларуская чыгунка сумесна з чыгуначнымі адміністрацыямі Украіны, Літвы, Латвіі і Польшчы загадзя правяла карэкціроўку раскладу руху міжнародных цягнікоў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Напрыклад, цягнік №86 Мінск — Кіеў, які ў цяперашні час адпраўляецца са сталіцы Беларусі ў 22.40 і прыбывае ў Кіеў у 8.40, з 29 кастрычніка будзе адпраўляцца з Мінска ў той жа час і прыбываць у Кіеў у 7.52. У зваротным напрамку з пераходам на «зімовы» час цягнік будзе адпраўляцца ў 21.06 (у цяперашні час адпраўляецца ў 22.10), час прыбыцця ў сталіцу Беларусі застанецца без змяненняў — 8.38.

Час адпраўлення з Мінска цягніка №805 Мінск — Вільнюс пасля пераходу на «зімовы» час застанецца без змяненняў — 8.00, але прыбываць у Вільнюс састаў будзе на гадзіну раней — у 9.30 (зараз — у 10.30). У адваротным кірунку цягнік №806 Вільнюс — Мінск будзе адпраўляцца ў 18.10 (зараз — у 19.10), час прыбыцця ў сталіцу застанецца без змяненняў — 21.40.

Пасля 29 кастрычніка таксама зменіцца расклад руху цягніка №87 Мінск — Рыга — састаў будзе адпраўляцца з Мінска ў 22.26 без змяненняў (час прыбыцця ў Рыгу зменіцца з 10.10 на 9.00); у адваротным кірунку цягнік №88 будзе адпраўляцца з Рыгі ў 19.20 (зараз — у 20.00) і прыбываць у сталіцу Беларусі без змяненняў у 7.50.

У цягніку №9 Масква — Варшава бесперасадачны вагон Мінск — Варшава, які ў цяперашні час адпраўляецца са сталіцы Беларусі ў 23.43 і прыбывае ў Варшаву ў 7.50, з 29 кастрычніка будзе адпраўляцца з Мінска ў 0.43 і прыбываць у Варшаву без змяненняў у 7.50. У адваротным кірунку з Варшавы час адпраўлення з 29 кастрычніка застанецца ранейшым — 15.50, а час прыбыцця ў сталіцу Беларусі зменіцца з 2.48 на 3.50.

Пасля пераходу на «зімовы» час таксама зменіцца час адпраўлення і прыбыцця цягнікоў міжнародных зносін, якія ідуць транзітам па тэрыторыі Беларусі ў краіны Заходняй Еўропы і ў адваротным кірунку. Акрамя таго, у сувязі са змяненнямі ў графіку руху міжнародных цягнікоў скарэктаваны і расклад некаторых цягнікоў рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній, якія курсіруюць па тэрыторыі Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Сі Цзіньпіна пераабралі на пасаду генеральнага сакратара ЦК Кампартыі Кітая

Месца ў ЦК таксама захаваў прэм'ер Дзяржсавета Лі Кэцян. У новы склад Пастаяннага камітэта Палітбюро ўвайшлі віцэ-прэм'ер Дзяржсавета Ван Ян, кіраўнік парткама Шанхая Хань Чжан, начальнік канцылярыі ЦК КПК Лі Чжаньшу, загадчык Арганізацыйнага аддзела ЦК КПК Чжаа Лэцзы (пленум абраў яго на пасаду кіраўніка Цэнтральнай камісіі па праверцы дысцыпліны) і загадчык Цэнтра палітычных даследаванняў пры ЦК КПК Ван Хунін. Падчас першага пленума Цэнтральнага камітэта Кампартыі Кітая 19-га склікання абраны новы склад Палітбюро ЦК. У яго ўвайшлі 25 чалавек, у іх ліку толькі адна жанчына — кіраўнік Аддзела Адзінага фронту ЦК Сунь Чуньлань. Па словах Сі Цзіньпіна, Кітай у наступныя гады працягне праводзіць актыўную палітыку па стымуляванні развіцця эканомікі краіны і ўсяго свету.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Сі Цзіньпіна з паспяховым завяршэннем XIX з'езда Кампартыі Кітая і пераабраннем на пасаду Генеральнага сакратара, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Вынікі з'езду прадэманстравалі ўмацаванне пазіцый Кітая на міжнароднай арэне, значныя поспехі кітайскага народа, дасягнутыя за апошнія пяць гадоў пад кіраўніцтвам КПК у сацыяльна-эканамічным развіцці, навуцы і культуры, — гаворыцца ў віншаванні. — У нашай краіне з вялікай цікавасцю ўспрынятыя вашы ідэі аб уступленні «сацыялізму з кітайскай спецыфікай у новую эпоху». Упэўнены, што ваша мадэль развіцця, заснаваная на «вернасці першапачатковай ідэі і імкненні наперад», знойдзе сваё прымяненне і ў іншых краінах».

## Курды прапануюць Багдаду дыялог

Улады курдскай аўтаноміі ў Іраку заявілі пра гатоўнасць замарозіць вынікі рэферэндуму і працэс абвяшчэння незалежнасці рэгіёна, прапанаваўшы Багдаду пачаць дыялог з тым, каб разрадзіць крызіс. Як вядома, рэферэндум аб незалежнасці прайшоў у Іракскім Курдыстане 25 верасня. Больш за 90% прагаласаваўшых выказалася за выхад з Ірака. Багдад вынікі плебісцыту не прызнаў і 16 кастрычніка пачаў ваенную аперацыю ў спрэчных рэгіёнах — у тым ліку ў нафтаносным Кіркуку. Менш чым за суткі армія вярнула кантроль над горадам, выбіўшы з яго курдскія ваенізаваныя фарміраванні «пешмерга».



## Тэрарысты на Блізкім Усходзе і ў Азіі гатовыя да нападаў

Аб гэтым заявіў намеснік дырэктара выканкама Рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры (РАТС) ШАС Ахат Мукашаў. У арганізацыі падзяляюць ацэнкі міжнародных экспертаў аб тым, што галоўная пагроза для міжнароднай бяспекі па-ранейшаму сыходзіць ад тэрарыстычных арганізацый, якія дзейнічаюць на Блізкім Усходзе і ў Афганістане. «Нягледзячы на панесеныя імі значныя страты, яны захоўваюць сваю баяздольнасць і гатовыя арганізаваць скаардынаваныя тэрарыстычныя атакі — як унутры, так і за межамі вышэйназваных рэгіёнаў», — адзначыў намеснік дырэктара РАТС.

## Сусветная вытворчасць віна адчувальна скарацілася



Глабальнае пацяпленне нанесла сакрушальны ўдар па сусветным рынку віна. Тэмпы яго вытворчасці сёлета скараціліся на 8,2% — такога за апошнія паўстагоддзя яшчэ не было, паведаміла Міжнародная асацыяцыя вінаградарства і вінаробства. Засуха і іншыя кліматычныя анамаліі сталі прычынай найбуйнейшага неўраджаю. У першую чаргу гэта адбілася на краінах, якія з'яўляюцца асноўнымі вытворцамі высакароднага напою. У Італіі вытворчасць віна ўпала на 23%, у Францыі — на 19%, а ў Іспаніі — на 15%. А вось у Новай Зеландыі, наадварот, тэмпы вытворчасці віна павялічыліся. Так што калі надвор'е працягне падкідваць непрыемныя сюрпрызы, геаграфія сусветнай вінай карты можа пачаць змяняцца ўслед за кліматам.

■ Ну і ну!

# Пазычаў грошы і прайграваў іх у казіно

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Першамайскага РУУС сталіцы затрымалі 37-гадовага мужчыну, які, выкарыстоўваючы розныя зачэпкі, пазычаў у знаёмай дзяўчыны грошы і прайграваў іх у казіно. Усяго ён не вярнуў 3,5 тысячы долараў.**

Маладыя людзі пазнаёміліся на сайце знаёмстваў летам гэтага года. Іх адносіны развіваліся даволі імкліва, і ўжо праз месяц мужчына пазычыў у сваёй новай сяброўкі грошай. Дзяўчына настолькі яму давярала, што распіску браць не стала. Пасля гэтага яна яшчэ некалькі разоў пазычала прыяцелю вялікія сумы на розныя мэты. Так, у адзін з дзён яна пазычыла 2,3 тысячы долараў нібыта на вяртанне доўгу. Але гэтыя грошы ў той жа дзень мужчына прайграў у казіно.

У нейкі момант дзяўчына перастала аказваць яму матэрыяльную дапамогу. Але гэта мужчыну не расстроіла, ён знайшоў просты выхад з сітуацыі — украў грошы. Знаходзячыся ў гасцях у дзяўчыны, непрыкметна ўзяў са скарбонкі 1,2 тысячы долараў. Планаваў на іх адыграцца ў казіно, але фартуна ў той дзень ад яго адвярнулася.

У дачыненні да мужчыны распачата крымінальная справа за крадзеж. Раней ён судзімы за аналагічнае злачынства, а таксама за махлярства і хуліганства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# З КАРАЛЕЎСКІМ РАЗМАХАМ


Так будзе выглядаць Стары замак пасля завяршэння ўсіх работ.

## ШТО ЗАСТАЛОСЯ З ДАЎНІНЫ

Абарончыя сцены захоўваюць элементы яшчэ з часоў Вітаўта, які на месцы драўлянай крэпасці Гродзенскага замчышча пабудаваў з каменя і цэглы гатычны замак з пяццю вежамі. У такім выглядзе ён прастаяў да 1580 года, пасля чаго абарончы замак пад кіраўніцтвам Стафана Баторыя пераўтварыўся ў двухпавярховы каралеўскі палац, багаты на розныя ўпрыгожванні і шыкоўны інтэр'ер. Але новая рэзідэнцыя не прынесла яе гаспадару шчасця. У хуткім часе кароль Рэчы Паспалітай, тут у Гродне, раптоўна адчуў недамаганне, і праз некалькі дзён яго не стала. Упершыню ва Усходняй Еўропе было зроблена анатамічнае анатаміраванне цела караля, але прычыну смерці так і не высветлілі.

Пацярпеў і Гродзенскі замак. Ён быў разбураны наступнымі войнамі, у XVII стагоддзі яго адбудавалі без былога каралеўскага глянцу.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Воблік яшчэ больш спрасціўся, калі ў XIX стагоддзі на тэрыторыі палаца размясцілі казарму, афіцэрскае казіно і ваенную бібліятэку. У такім выглядзе ў сярэдзіне 20-х гадоў мінулага стагоддзя Стары замак перадалі археалагічнаму музею, на яго тэрыторыі пачаліся раскопкі, у выніку чаго ўдалося выявіць рэшткі знакамітай Ніжняй царквы, якая была пабудавана ў часы Вітаўта. Яна ўваходзіць у музейны комплекс. А руіны абарончага вала сёння сталі глядзельнай пляцоўкай, адкуль можна ўбачыць панараму наднёманскіх краявідаў.

Цяпер выгляд самога будынка, узятага ў шэрую тынкоўку, не ўражвае. Нічога агульнага з сапраўдным замкам. Вось гэтую акалічнасць і спрабуюць выправіць.

## ЧАМУ БУДЗЕ ПРАЕКТ «ПАВОДЛЕ БАТОРЫЯ»

Рэстаўрацыя даўно наспела. Але спецыялісты ніяк не маглі вызначыцца, які павінен стаць канчатковы выгляд замка. Спрэчкі вяліся яшчэ з 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Ад варыянта ўзнаўлення «паводле Вітаўта» ў стылі готыкі прыйшлося адмовіцца — ад тых часоў мала што засталося. Тады за аснову было вырашана ўзяць праект мінскага архітэктара Уладзіміра Бачкова. Ён прапанаваў узнавіць замак у стылі Рэнесансу, гэта значыць часоў Стафана Баторыя. Каралеўскі палац будаваўся па італьянскім праекце і ўражваў веліччу і дэкорам. Элементаў той эпохі дайшло значна больш.

Была прапанова разам з замкам узнавіць Ніжнюю царкву і вежы часоў Вітаўта па перыметры абарончай сцяны. Але і ад гэтага ў хуткім часе адмовіліся, бо няма звестак аб тым, як яны выглядалі. Разам з тым палац Стафана Баторыя можна рэстаўрыраваць з вялікай доляй дакладнасці: да нас дайшла выява палаца на гравюры 1600 года Тамаша Макоўскага.

Распрацоўка эскізных праектаў вядзецца інстытутам «Гродначграмадзянпраект». Першая чарга ўключае работы па будаўніцтве і рэканструкцыі паўночна-заходняй часткі з Сярэдняй вежай, брамай і прыбудовай XVII стагоддзя, закрытай галерэі і прыбудаванай да яе камяніцы. Пасля доўгіх дэбатаў і пошукаў сродкаў работы, нарэшце, пачаліся. Першы этап рэканструкцыі працягнецца да 2020 года.

## ШТО ПАКАЗАЛА РАЗБОРКА ПЛАСТОЎ

Стары замак ужо ператвараецца ў будаўнічую пляцоўку. Пра маштабы работ сведчыць той факт, што задзейнічаны ў рэканструкцыі два буйныя прадпрыемствы: «Гроднапрамбуд» і «Гроднажылбуд». Работа ідзе па розных кірунках. Асноўнае — разборка больш позніх пластоў. З кожным днём з-пад шэрай тынкоўкі праступаюць новыя ўчасткі старажытнага муру. Ён бачны ўжо на большасці сцен. Ход работ уважліва адсочваюць спецыялісты — будаўнікі сумесна з праектантамі.

Па словах **галоўнага архітэктара «Гроднаграмадзянпраекта» Алега ШЫМБАРЭЦКАГА,** нюансаў нямала, таму што кожная аперацыя патрабуе індывідуальнага падыходу, спецыяльнага інструменту, што ўскладняе работу. Да таго ж адчуваецца адсутнасць службаў, якія займаюцца арганізацыйнымі пытаннямі. Гэта важна яшчэ і з той прычыны, што рэстаўрацыя замка мае першую катэгорыю, найбольш ашчадную ў захаванні аўтэнтычнасці.

Напрыклад, зараз разглядаецца пытанне па ўмацаванні ўязной аркі, якая знаходзіцца ў аварыйным стане.

— Стан арыгінальнай аркі выклікае трывогу, бо ёсць шмат выпадзенняў, — паведаміў Алег Шымбарэцкі. — Сцяна крывая, і невядома, як яе ўмацаваць. Мы падвялі страхавачныя бэлькі, выканалі іншыя супрацьаварыйныя мерапрыемствы, але неабходна зрабіць больш шчыльнае прымыканне.

Здараюцца прыемныя знаходкі. Пры расчыстцы галерэі, якая злучае дзве часткі замка, будаўнікі днямі дайшлі да пласта пліткі XVI стагоддзя. Для гэтага ім прыйшлося зняць паўметра будаўнічага смецця і новай падлогі. Калі галерэя набудзе канчатковы выгляд, старажытная плітка зноў зойме сваё першапачатковае месца, а зараз яна складзіруецца ў сховішчы, паведамілі работнікі музея. Знойдзена ў галерэі і чарапіца каралеўскай эпохі, якая таксама будзе выкарыстана пры рэканструкцыі.

Згодна з праектам, галерэя будзе адкрыта для наведвальнікаў, якія змогуць выйсці на адкрытую пляцоўку і палюбавацца панарамай горада. Адбудзецца гэта не раней, чым праз 2—3 гады. Вясной пачнуцца работы па разборцы даху і муру, які зроблены пазней за XVI стагоддзе. Затым замак будзе дабудоўвацца паводле праекта.

## СЮРПРЫЗЫ ПАДЗЕМНАГА ЗАМЧЫШЧА

Паралельна з расчысткай сцен будаўнікі і навукоўцы вядуць раскопкі. Гэта знакавае месца, бо адсюль, з Замкавай гары, і пачаўся горад Гродна, якому амаль 900 гадоў. **Супрацоўнік аддзела археалогіі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Алесь ГАРШКОЎ** паведаміў, што ўжо дайшлі да пластоў XIV стагоддзя, якія сведчаць аб былых пажарах. Тым не менш ёсць нямала цікавых знаходак. Гэта ў асноўным металічныя нажы, цвікі, гузікі, манеты, фрагмент гарматы, гаршковыя кафлі.

А літаральна днямі ўсе былі ўзрушаны новай знаходкай — шахматнай ладдзёй, вырабленай з рога. Дарэчы, шахматную ладдзю, але з жоўтага каменя і іншай формы, тут знайшлі яшчэ ў 1930-я гады. Мяркуюць, што яна адносіцца да XII стагоддзя. Па гэтым узоры гродзенскі скульптар Уладзімір Панцялееў высек з каменя павялічаную выяву старажытнага судна — ладдзі, якая ўстаноўлена каля замка на беразе Нёмана. Новая знаходка не менш каштоўная, бо таксама старажытная, хоць і адносіцца да больш позняга XVI стагоддзя. Такі «ўзрост» вызначыў аўтар знаходкі Аляксандр Хацько, навуковы супрацоўнік музея. Ён параўнаў аналагі, якія захоўваюцца ў еўрапейскіх і беларускіх фондах, і зрабіў вывад, што гэта — надзвычай каштоўная рэч.

Навукоўцы музея ставяць задачу дасягнуць «матэрыка», гэта значыць даследаваць увесь культурны пласт, заглыбіцца на сем метраў. Тут могуць быць пласты ранейшых паселішчаў, можа, нават, жалезнага веку. Чаранковыя наканечнікі гэтага перыяду былі знойдзены падчас раскопак 30-х гадоў. Апантаныя археолагі мяркуюць працаваць і зімой. Калі пачнецца актыўная фаза рэканструкцыі, тут усё замуруюць, і для археалогіі гэты пласт будзе страчаны, растлумачыў Алесь Гаршкоў. Згодна з праектам, на месцы раскопак будзе пабудавана так званая мерная хата тых часоў. Круты схіл, на якім на вышыні амаль 30 м стаіць Стары замак, будзе ўмацаваны, а на час рэканструкцыі збіраюцца зрабіць навясны мост для будаўнікоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# СПРЭЧНАЕ ПАДМІКОЛЛЕ


Фота Галіны РАДЗЬКОВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Развіццё ўсіх зялёных зон горада адбываецца ў адпаведнасці з нядаўна зацверджаным Генеральным планам Магілёва і на аснове пэўных базавых канцэпцый, прадугледжаных планам, — спрабуе супакоіць насельніцтва **намеснік старшыні гарвыканкама Аляксандр ВЯРАКСА.** — Усе астатнія моманты вызначаюцца пры распрацоўцы лакальных праектаў. Магу заявіць з усёй адказнасцю: ніхто свядома дрэвы там не ліквідуе.

— Усе дрэвы абыходзім, захоўваем асобнікі каштоўных парод. Калі нейкая сцяжынка выходзіць на дрэва, заказчыкі даводзяць інфармацыю да ведама будаўнікоў, праектная арганізацыя ўносіць карэкціроўку, — пацвердзіў **начальнік упраўлення архітэктуры і будаўніцтва Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір СКАЧАК.**

**Дырэктар прадпрыемства «Магілёўзеленбуд» Пётр АЛЯКСЕЙЧЫКАЎ** прадэманстраваў заключэнне Цэнтральнага батанічнага сада НАН Беларусі:

— Мы былі занепакоены тым, што вяз і ясень пачалі ўсыхаць. Зрабілі запыт, і спецыялісты далі нам заключэнне, што ў парку ёсць дрэвы, пашкоджаныя рознымі хваробамі, параілі, што трэба рабіць, каб зараза не распаўсюджвалася.

На заўвагу карэспандэнта «Звязды» наконт інвентарызацыі «падмікольскіх» дрэў Аляксандр Вяракса пагадзіўся, што на найбольш каштоўныя пароды ў Магілёве павінны быць заведзены ўліковыя карткі і зроблены пашпарты.

## Парк пад відэаназіраннем

Заказчык аб'екта «Парк адпачынку «Падміколле» — магілёўскае ўпраўленне камунальных прадпрыемстваў. Менавіта яно рэгулюе ўсе будаўнічыя моманты ў раёне складанай зоны. Актывісты лічаць, што работа вядзецца бессістэмна, няма комплекснага плана развіцця.

— Тэрыторыя Падміколля займае болей за 100 гектараў, і адным праектам рэалізаваць яе добраўпарадкаванне, улічваючы, што асноўная крыніца фінансавання — гарадскі бюджэт, не ўяўляецца магчымым. Таму мы робім кавалачкамі, — тлумачыць **генеральны дырэктар прадпрыемства Андрэй КІБЛОЎ.** — У парку будуць створаны зона адпачынку для сталых грамадзян, для маладых сем'яў — дзіцячая гульнявая з вяровачным гарадком. Усе гэтыя зоны звяжуць веласіпедныя і пешаходныя сцежкі. На сёння, дарэчы, зроблена больш за 3 кіламетры веласіпедных дарожак і болей за 6 кіламетраў — пешаходных. На ўсёй працягласці будуць усталяваны альтанкі, фантанчыкі для піцця.

Андрэй Кіблоў таксама паведаміў, што ў прадпрыемства ёсць адпаведныя дагаворы з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі наконт ажыццяўлення нагляду за будаўнічымі работамі.

— Яшчэ ён звярнуў увагу на тое, што праектна-каштарысная дакументацыя на добраўпарадкаванне тэрыторыі прайшла ўзгадненне з Міністэрствам культуры.

А хутка ўсе дзеянні на «падмікольскай» тэрыторыі наогул будуць пад пільным вокам відэакамер. Андрэй Кіблоў паведаміў, што магілёўскае прадпрыемства «Гарсвятло» ўжо закупіла абсталяванне для сістэмы відэаназірання і на працягу лістапада яно будзе змантавана.

## Пакроўскі пасад у мініяцюры

Цікавае рашэнне прапануе ініцыятыўная група «Падміколле». На імя старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзіміра Цумарава накіраваны праект «Музейна-гістарычны комплекс «Пакроўскі пасад» (яшчэ адна з гістарычных назваў Падміколля). Асноўныя яго аб'екты — алея ў гонар 300-гадовага юбілею Свяціцеля Георгія Каніскага, парк мініяцюр — паменшаная копія Пакроўскага пасада, музей мяшчанскага быту для захавання шматлікіх знаходак і артэфактаў Падміколля з пакоем, прысвечаным магілёўскаму Свяшчэннамучаніку Паўліну, і цэнтр сямейнага вольнага часу імя А. Пушкіна «У лукамор'я» — як памяць аб наведванні паэтам Магілёва. Адной з галоўных задач гэтага цэнтра будзе папулярызацыя беларускай культуры і гісторыі. Пад зваротам у гарвыканкам свае подпісы паставілі гісторыкі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, органа мясцовага самакіравання, звычайныя жыхары.

— Падміколле з XVI стагоддзя мела планіровачную сістэму, а цяпер разглядаецца як проста парк. Гісторыкі прапаноўваюць зрабіць трасіроўку вуліц, паказаць, дзе знаходзіліся пабудовы, а іх ігнаруюць. Гэта не нармальна. Сучасная моладзь думае, што ў Падміколлі ўвесь час была пустка. У Магілёва вельмі багатая гісторыя, і трэба прыкласці ўсе намаганні для яе захавання, — перажываюць магіляўчане.

## Рабочая група просіць увагі

На круглым стале, які прайшоў па ініцыятыве Міністэрства архітэктуры ў студзені, была створана рабочая група. Але яе ўдзельнікам не стае ўвагі, яны скардзяцца, што іх прапановы ігнаруюцца.

— Хацелася б болей цеснага кантакту з праектантамі, — адзначыў член рабочай групы, **прадстаўнік грамадскага аб'яднання «Экапраект» Леанід ПЛАТОНЕНКА.** — Мы выступаем за тое, каб стварыць унікальнае месца адпачынку для гараджан, яно заслугоўвае прадуманых, дакладных рашэнняў. І ўдзел грамадскасці толькі пазітыўна на гэта можа паўплываць. На сёння лакальныя праекты не абмяркоўваюцца з грамадскасцю, таму і ўзнікаюць пытанні.

— Група створана, але нікому не вядомы яе правовы статус, — дадае магілёўскі **гісторык Аляксандр БЕЛАХВОСТАЎ.** — Мы збіраліся некалькі разоў, але нашы думкі нікому не цікавыя. Як і прапановы магілёўскіх археолагаў. Яны прадставілі гісторыка-апорны план Пакроўскага пасада яшчэ ў красавіку. На ім былі нанесены «магдэбургскія» вуліцы 1578 года, якім у наступным годзе спаўняецца 440 гадоў. Перададзены таксама аэрафотаздымкі, карты XVII і XVIII стагоддзяў, адпаведная літаратура. Чаму гэта ігнаруецца?

— Мы пакуль ствараем базавую мадэль засваення гэтай тэрыторыі, — падвёў вынік сустрэчы Аляксандр Вяракса. — Потым яна яшчэ будзе напаўняцца. Магчыма, музеем якім, калі знойдуцца спонсары. Давайце прымем удзел у працы рабочай групы. Я згодны з тым, што, калі стварылі рабочы орган, трэба вызначыцца з яго асноўнымі палажэннямі. Каб быў зразумелы рэгламент, перыядычнасць збораў, наколькі правамоцныя яго рашэнні. Пры рэалізацыі такіх складаных праектаў, вядома, будзе шмат меркаванняў, спрэчак, ідэй. Але калі б мы нічога не рабілі і толькі б спрачаліся, баршчэўнік у Падміколлі дасягнуў бы ўжо 10 метраў.

Пад канец Аляксандр Вяракса ўсіх запрасіў на суботнік, які адбудзецца 28 кастрычніка:

— Давайце папрацуем на карысць Падміколля. Для пачатку пачнём садзіць дрэвы. Тут ніякіх грошай не трэба — саджанцамі забяспечым, інструмент дадзім, маральна падтрымаем. І ў нас застанецца яшчэ болей за 100 гектараў вольных плошчаў, дзе рэалізуем усе прапановы, калі яны не абсурдныя, чымсьці пацверджаныя, запатрабаваныя і будуць цікавыя гараджанам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

26 КАСТРЫЧНІКА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№20 (15827)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Антон КАЛЕНІК: «Прыпраўляю стравы ўсмешкай»



Фота Надзеі БУЖАН.

**Беларус Антон Каленік уваходзіць у спіс найлепшых шэф-кухараў свету. Нядаўна ён атрымаў званне World Master Chef — адзіны, хто мае такі тытул на тэрыторыі СНД. За дзесяць хвілін, што Антон пазіраваў на кухні рэстарана для нашага фатографа, ён паспеў прыгатаваць пасту з гароднінай і шампіньёнамі. І пакуль мы здымалі пробу, расказаў, за што атрымаў мянушку «чалавек-кальмар», як прыдумвае рэцэпты і чым беларуская кухня падобная да італьянскай.**

***— Любоў да кулінарыі ў вас з дзяцінства?***

— Так. Памятаю, у шэсць гадоў быў у бабулі на канікулах. Яна гатавала абед для ўсёй сям'і (ячную кашу з мясам), і я папрасіў маленькі чыгунок, каб зрабіць тое ж самае, але на свой капыл. Адправілі тушыць у печ: бабуля свой гаршчок вілкамі падчапіла і некуды ў кут паставіла, а я — у самы агонь. Потым дастаю гэты чыгунок, а там усё згарэла. І толькі ў цэнтры засталася чайная лыжачка кашы, якую можна было яшчэ з'есці. Але яна была вельмі смачная!

Пасля таго і стаў практыкавацца. Прыходзіў са школы, даставаў маміны рэцэпты... А яна ў мяне працуе доктарам. Вы ж ведаеце, як пішуць урачы *(смяецца)*? Карацей, у сметніцу пайшло вельмі шмат прадуктаў.

Пасля заканчэння школы ў мяне не было іншых варыянтаў, куды паступаць. Нават на ўроках па працоўным навучанні хутка рабіў зэдлікі, каб адпрасіцца і збегаць да дзяўчат — паглядзець, што яны гатуюць.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

У люстэрку сацыялогіі

## ШТО ДЛЯ МОЛАДЗІ СЯМ'Я?

### Студэнцкія разважанні на гэтую тэму

**Як маладыя людзі ставяцца да шлюбу і розных яго формаў, нараджэння і выхавання дзяцей, да абавязковага дэкрэтнага водпуску для бацькі немаўляці, якія ў іх сямейныя каштоўнасці і мадэлі паводзінаў у сям'і? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі даследавання, якое праводзілася ў рамках практыкі студэнтаў аддзялення сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук сумесна з Цэнтрам сям'і і дзяцінства псіхалагічнай службы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

**Некаторыя з яго вынікаў падчас круглага стала, што адбыўся ў ВНУ ў рамках правядзення бацькоўскага месяца, агучыла кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры сацыялогіі БДУ Ларыса ФІЛІНСКАЯ.**

#### Шлюбныя перашкоды

Даследаваннем была ахоплена студэнцкая моладзь, што навучаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы і Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Аркадзя Куляшова на дзённай форме навучання.

Як паказала анкетаванне, 29 працэнтаў студэнцкай моладзі БДУ лічаць афіцыйную рэгістрацыю шлюбу неабходнай, яшчэ 48 працэнтаў выступаюць, хутчэй, за дзяржаўную рэгістрацыю шлюбу, чым супраць яе. Увогуле тры чвэрці апытаных студэнтаў і студэнтак выказваюцца на карысць дзяржаўнай рэгістрацыі адносін. Хутчэй негатыўнае стаўленне да афіцыйнай рэгістрацыі шлюбу выказваюць каля 13 працэнтаў апытанай моладзі з БДУ.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Пазнаёміцца з прафесіяй

## «СТАНЦАВАЦЬ АД ПЕЧКІ», або Навошта патрэбная тысяча цаглін

**Нядаўна ў метро ўвагу прыцягнула аб'ява: «Запрашаем на курсы печнікоў». Прафесія сёння рэдкая і, здавалася б, сярод моладзі забытая. Як хутка можна асвоіць гэта рамяство і хто ідзе ў печнікі, мы даведаліся ў Мінскім дзяржаўным прафесійным ліцэі №5 транспартнага будаўніцтва, дзе і праводзяцца курсы.**

### УЛАДАРЫ ЦЯПЛА

Курсы печнікоў у ліцэі адкрылі сем гадоў таму, цяпер яны вельмі папулярныя.

— Ёсць ужо заявы на студзень, — кажа **намеснік дырэктара ліцэя па вучэбна-вытворчай рабоце Алена ДАРОШКА.** — Бяром усіх: ад піянераў да пенсіянераў. За год звычайна выпускаем тры групы. Курсы цягнуцца два месяцы. Паўтара тыдня тэорыя (у праграме ёсць чарчэнне, асновы эканомікі, ахова працы і нават этыка дзелавых адносін), астатні час — практыка. Інструмент і матэрыялы для заняткаў мы даём.

Вучыцца прыходзяць людзі розных прафесій: стаматолаг, праграміст, ратавальнік, малодшы навуковы супрацоўнік універсітэта. Гэта не толькі мінчане — былі слухачы з Полацка, Слуцка. Іншагароднім ліцэй прапануе месца ў інтэрнаце за 30 рублёў у месяц.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Асвойваць рамяство прыходзяць людзі розных узростаў і прафесій.**

# ШТО ДЛЯ МОЛАДЗІ СЯМ'Я?


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Некалькі іншая сітуацыя назіраецца сярод рэспандэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта і Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта: 84,5 працэнта апытаных у ГрДУ выступаюць хутчэй за афіцыйную рэгістрацыю шлюбу, чым супраць яе, а негатыўнае стаўленне выказваюць менш за 10 працэнтаў. Сярод студэнцкай моладзі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта пазітыўна настроены ў адносінах да дзяржаўнай рэгістрацыі больш як 87 працэнтаў апытаных, а супраць выказаліся менш за 5 працэнтаў.

На думку даследчыкаў, гэта можа быць звязана з тым, што пражыванне ў сталіцы фарміруе некалькі іншыя прыярытэты, чым пражыванне ў рэгіёнах. У Мінску студэнцкая моладзь у значна большай ступені настроена на пабудову кар'еры, а дзяржаўная рэгістрацыя адносін, магчыма, бачыцца ім як адна з перашкод на шляху прафесійнай самарэалізацыі. Сталічныя студэнты больш дынамічныя, і хочуць заставацца як мага больш свабоднымі, бо прафесійнае станаўленне часта вымагае максімум аддачы і часу.

Большасць (64 працэнты) той часткі студэнцкай моладзі БДУ, якая ўхваляе фактычнае сужыццё, лічыць, што «перад афіцыйным уступленнем у шлюб людзі павінны пажыць разам у мэтах праверкі сумяшчальнасці». 41 працэнт апытаных адзначылі, што «няма ніякай прынцыповай розніцы паміж афіцыйнай рэгістрацыяй шлюбу і фактычным сужыццём». 21 працэнт лічыць, што «незарэгістраваны шлюб прадугледжвае абсалютную свабоду партнёраў, няма штучных перашкод да разрыву адносін».

## Каб не страціць прывабнасць...

У студэнтаў пацікавіліся: «Што павінен рабіць ваш выбраннік/выбранніца, каб заставацца цікавым і прывабным для вас у доўгатэрміновай перспектыве?»

«Прымаць удзел у жыцці сям'і» — так адказаў 61 працэнт апытаных. «Падтрымліваць і развіваць свой інтэлектуальны ўзровень» — прыкладна столькі ж. «Умець знаходзіць кампрамісы, саступаць» — 51 працэнт. «Падтрымліваць сябе ў добрай фізічнай форме» — каля 42 працэнтаў. «Сачыць за станам свайго здароўя» — 42 працэнты. «Захоўваць асноўныя рысы характару» — каля 41 працэнта. «Прадастаўляць асабістую прастору» — 21 працэнт. «Весці актыўнае сексуальнае жыццё» — 20 працэнтаў. «Мець пастаянную перспектыўную работу» — амаль кожны пяты.

— Але варта звярнуць увагу на гендарныя асаблівасці ў адказах на гэтае пытанне, — падкрэслівае Ларыса Філінская. — Так, большасць дзяўчат (71 працэнт) лічаць, што іх партнёр павінен прымаць удзел у жыцці сям'і, у той час як менш за палову юнакоў (43 працэнты) упэўнены ў тым, што іх выбранніца павінна рабіць гэта для таго, каб заставацца цікавай і прывабнай для іх у доўгатэрміновай перспектыве. Больш за палову дзяўчат (57 працэнтаў) адзначаюць, што іх выбраннік павінен умець знаходзіць кампрамісы і саступаць. Аднак толькі крыху больш за траціну юнакоў лічаць, што такое ўменне неабходна для іх выбранніц. Дзяўчатам таксама ў большай ступені важна, каб іх выбраннік меў пастаянную і перспектыўную работу.

**Мужчыны жадаюць бачыць побач з сабой, перш за ўсё прыгожую, верную і гаспадарлівую дзяўчыну.**

Большая частка юнакоў перакана081ныя, што гарантам захавання цікавасці да выбранніцы з'яўляецца яе ўменне падтрымліваць сябе ў добрай фізічнай форме, і толькі крыху больш за траціну апытаных дзяўчат (36 працэнтаў) прад'яўляюць такое патрабаванне да сваіх выбраннікаў. Адрозненні паміж мужчынамі і жанчынамі назіраюцца і ў патрабаванні змагацца з узроставымі змяненнямі ў знешнасці (20 працэнтаў юнакоў супраць 5 працэнтаў дзяўчат). Гэта можа быць звязана з тым, што традыцыйна арганізацыяй побыту сям'і займаецца жанчына. Таму для дзяўчат важна, каб іх выбраннік прымаў удзел у жыцці сям'і і ствараў спрыяльны эмацыянальны клімат, у той час як юнакоў больш цікавіць, каб іх выбранніца інтэлектуальна, псіхалагічна і фізічна ім падыходзіла.

## Погляды на кар'еру

Большасць апытаных студэнтаў БДУ (82 працэнты) выказаліся за роўнае размеркаванне абавязкаў у сям'і. Усяго 18 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што абавязкі па вядзенні гаспадаркі і выхаванні дзяцей павінны ляжаць на жанчыне, а мужчына павінен фінансава забяспечваць сям'ю. Істотных адрозненняў у адказах студэнтаў БДУ, МДУ і ГрДУ не назіраецца.

Але важна звярнуць увагу на адрозненне ў поглядах дзяўчат і юнакоў. Так, дзяўчаты ў большай ступені прытрымліваюцца думкі, што абавязкі ў сям'і павінны размяркоўвацца ў роўнай ступені паміж жанчынай і мужчынам (доля дзяўчат, якія так лічаць, склала 87 працэнтаў, а доля юнакоў — 71 працэнт). 29 працэнтаў хлопцаў упэўненыя, што галоўны абавязак мужчыны — фінансава забяспечваць сям'ю, а жанчыны — займацца хатняй працай і выхаваннем дзяцей (такога ж меркавання прытрымліваюцца і 13 працэнтаў дзяўчат).

Пераважная большасць студэнтаў БДУ (89 працэнтаў) выказаліся за тое, што абодва (і муж, і жонка) павінны мець роўныя магчымасці пры пабудове кар'еры. У той жа час каля 11 працэнтаў студэнтаў прытрымліваюцца пазіцыі, згодна з якой пабудова кар'еры — гэта прыярытэт толькі для мужчыны, а задача жанчыны — яго падтрымліваць.

Важна адзначыць істотнае разыходжанне ў меркаваннях па гэтым пытанні сярод юнакоў і дзяўчат. Так, практычна ўсе дзяўчаты (94 працэнты) лічаць, што жанчына павінна мець роўныя з мужчынам магчымасці пры пабудове кар'еры, а сярод юнакоў такога меркавання прытрымліваецца 79 працэнтаў. У той жа час кожны пяты з хлопцаў лічыць, што пабудова кар'еры не з'яўляецца прызваннем жанчыны, а вось сярод дзяўчат такога меркавання прытрымліваюцца менш за 6 працэнтаў. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што студэнцкай моладзі ў большасці сваёй уласцівыя прагрэсіўныя погляды на сям'ю і ролю ў ёй жанчыны. Аднак істотная частка студэнтаў усё яшчэ прытрымліваецца традыцыйных поглядаў, прычым, юнакам гэта ўласціва ў большай ступені, чым дзяўчатам.

## Вернасць і добры характар

Для высвятлення характарыстык ідэальнай мадэлі адносін у сям'і ў студэнцкай моладзі пацікавіліся: «Што, на вашу думку, з'яўляецца абавязковым, пажаданым і што не мае значэння для шчаслівага сямейнага жыцця?» Прапаноўвалася даць ацэнку па 12 параметрах.

Пераважная колькасць рэспандэнтаў адказалі, што пытанне аб сумесным пражыванні сямейных рашэнняў з'яўляецца абавязковым (71 працэнт). Чвэрць рэспандэнтаў адказалі, што яно з'яўляецца пажаданым. І толькі для нязначнай колькасці рэспандэнтаў гэта «не мае значэння»...

Каля паловы рэспандэнтаў (41,5 працэнта) лічаць, што наяўнасць дзяцей «з'яўляецца абавязковай», крыху меншая колькасць (37 працэнтаў) выбралі адказ «з'яўляецца пажаданай». І амаль кожны пяты з апытаных адказаў, што наяўнасць дзяцей не мае значэння.

Пераважная колькасць рэспандэнтаў (83 працэнты) на пытанне датычна шлюбнай вернасці з боку жонкі (мужа) адказвалі «з'яўляецца абавязковай». Падобная тэндэнцыя ў адказах прасочваецца ў МДУ імя Аркадзя Куляшова (87 працэнтаў), а ў Гродзенскім дзяржуніверсітэце гэты адказ выбралі яшчэ часцей (92,5 працэнта).

Таксама варта адзначыць, што чатыры працэнты юнакоў выбралі адказ «не мае значэння», у той час як дзяўчаты наогул не выбіралі гэты варыянт адказу.

Для студэнтак найбольшае значэнне разам з вернасцю маюць такія якасці выбранніка, як адказнае стаўленне да стварэння сям'і, эмацыянальна-псіхалагічная сумяшчальнасць і добры характар. У той час як юнакі найбольшае значэнне нараўне з вернасцю надаюць наяўнасці такіх якасцяў і характарыстык у выбранніцы, як добры характар, адукаванасць і эрудыцыя, а таксама прывабная знешнасць.

Такім чынам і юнакі, і дзяўчаты ідуць традыцыйным шляхам вылучэння патрабаванняў да процілеглага полу: дзяўчатам важна адказнае стаўленне партнёра да стварэння сям'і, паспяховасць і матэрыяльны дастатак мужчыны, а мужчыны жадаюць бачыць побач з сабой, перш за ўсё прыгожую, верную і гаспадарлівую дзяўчыну.

## Адпраўляем бацьку ў дэкрэт

На пытанне аб сумесным удзеле мужа і жонкі ў выхаванні дзяцей пераважная колькасць рэспандэнтаў (80 працэнтаў) адказалі, што ён з'яўляецца абавязковым. Адказ «з'яўляецца пажаданым» выбралі крыху больш за 15 працэнтаў рэспандэнтаў. Разам з тым дзяўчаты часцей адказвалі, што сумеснае выхаванне дзяцей з'яўляецца абавязковым...

Даследчыкаў таксама цікавіла, як студэнцкая моладзь ставіцца да знаходжання ў дэкрэтным адпачынку мужчыны. У цэлым не згодныя з тым, што дэкрэтны адпачынак для мужчыны супярэчыць традыцыям, 49 працэнтаў апытаных (56 працэнтаў дзяўчат і 37 працэнтаў юнакоў).

На пытанне «Бацька ў дэкрэтным адпачынку не зможа сачыць за дзіцем гэтак жа старанна, як яго маці?» больш за ўсё адказаў было адмоўных (52 працэнты нязгодных з гэтым сцвярджэннем). Рэспандэнты ў сваёй большасці лічаць, што бацька здольны сачыць за дзіцем не горш за маці. Гэта сведчыць пра тое, што мужчынам сталі больш давяраць.

Рэспандэнты ў цэлым згодныя з тым, што дэкрэтны адпачынак дае магчымасць мужчыну зблізіцца з дзіцем, лепш яго пазнаць, абудзае бацькоўскую любоў: з гэтым пагадзілася 66 працэнтаў ад усіх апытаных.

Пераважная большасць (72 працэнты) юнакоў поўнасцю або часткова падзяляюць меркаванне аб тым, што «галоўнае ў жанчыне, каб яна была добрай маці і гаспадыняй», у той час як сярод дзяўчат з гэтым сцвярджэннем пагадзілася толькі палова.

Большасць юнакоў (69 працэнтаў) цалкам ці хутчэй згодныя са сцвярджэннем, што «жанчына/мужчына павінна/павінен мець захапленні, не звязаныя з сям'ёй». Для высвятлення поглядаў студэнтаў і студэнтак на ролю мужчыны і жанчыны ў сям'і прапаноўвалася выказаць сваю згоду або нязгоду з шэрагам сцвярджэнняў.

Са сцвярджэннем «самы галоўны клопат мужа — забяспечыць матэрыяльны дастатак і бытавы камфорт сям'і» цалкам ці хутчэй згодна пераважная большасць юнакоў (86 працэнтаў), сярод дзяўчат гэты паказчык ніжэйшы на 14 працэнтаў. Са сцвярджэннем «муж павінен умець абслужыць сябе, а не чакаць, што жонка возьме на сябе ўсе клопаты аб ім» цалкам і хутчэй згодны большасць апытаных (76,6 працэнта юнакоў і 82 працэнты дзяўчат).

«Кім, на ваш погляд, павінны прымацца важныя для сям'і рашэнні?» Варта адзначыць адрозненні ў размеркаванні адказаў на гэтае пытанне. Кожны дзявяты студэнт БДУ прытрымліваецца думкі, што мужчыне варта адвесці галоўную ролю ў прыняцці важных для сям'і рашэнняў. У той час як вядучую ролю жанчын у гэтым пытанні падтрымліваюць толькі кожны пяцідзясяты студэнт. Сярод студэнтаў МДУ і ГрДУ можна назіраць яшчэ больш кансерватыўныя погляды: кожны восьмы і кожны шосты студэнт адпаведна лічаць, што толькі мужчына можа прымаць важныя для ўсёй сям'і рашэнні. І толькі 0,9 працэнта студэнтаў у МДУ і адзін працэнт студэнтаў у ГрДУ прытрымліваюцца думкі, што жанчына мае права аднаасобна прымаць важныя для сям'і рашэнні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З базай у галаве

# ВІРТУАЛЬНАЯ ФІЗІКА ДЛЯ ЛІРЫКАЎ

**Студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ перамаглі ў намінацыі «За самую перспектыўную ідэю» ў Фэсце адукацыйных тэхналогій «Startup Edutech Fest». На суд журы яны прадставілі ўнікальны адукацыйны праект «Vedex VR Edutainment», які не мае аналагаў у Беларусі.**

Ідэя распрацоўкі належыць чацвёртакурснікам Дзмітрыю Аксеніку, Раману Багдановічу і другакурсніку Ігару Дорашаву. Навуковым кіраўніком хлопцаў выступіла асістэнт кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак ФПМІ Анастасія Гусейнава.

Праект, які перамог, прадугледжвае магчымасць навучання ў віртуальнай рэальнасці, што зробіць вучобу займальнай і запамінальнай. У цяперашні час распрацаваны тры ўрокі ў вобласці фізікі і матэматыкі. Для таго каб прайсці навучанне, школьнікам неабходна спампаваць на мабільную прыладу спецыяльную праграму і надзець акуляры 3D.

Адукацыйны стартап уключае як тэарэтычную, так і практычную частку навучання. Для замацавання матэрыялу школьнікам прапануецца выканаць шэраг доследаў, кожны з якіх дэманструе матэрыял, выкладзены ў адпаведным параграфе падручніка. Над увасабленнем ідэі візуалізацыі школьнай праграмы студэнты працуюць з 2016 года.

Фэст «Startup Edutech Fest» праводзіўся ў Мінску ўпершыню. Прапект дае стваральнікам адукацыйнага прадукту магчымасць стасункаў з інвестарамі, экспертамі ў сферы IT, адукацыі і рэкламнай індустрыі. Яго ўдзельнікамі сталі 19 каманд з Беларусі, якія стварылі праекты з практычнай значнасцю для сучаснага рынку. Тэматычнае поле інавацый ахоплівае адукацыю, сферу IT, стварэнне адукацыйнага кантэнту, тэставанне, аналітыку, камунікацыйныя пляцоўкі і г. д.

За стварэнне перспектыўнай ідэі студэнты БДУ ўзнагароджаны сертыфікатам для ўдзелу ў чвэрцьфінале аднаго з самых буйных у Беларусі хакатонаў «Social Weekend». Таксама маладыя распрацоўшчыкі атрымалі сертыфікат для праходжання ментарскіх прафесійных кансультацый і магчымасць тэставання свайго прадукту ў камп'ютарнай акадэміі «Крок».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Галасы маладых*

# СПЯВАЦЬ, УЛАД, НЕ ПЕРАСПЯВАЦЬ!

**Маленькая, але ж вельмі яркая і прыкметная ўсім «зорачка» Уладзіслава КАЧАНА ўзышла на музычным небасхіле Смалявіччыны больш за дзесяць гадоў таму. З таго часу, з сярэдзіны нулявых, ён, вучань малодшых класаў харавога аддзялення і класа фартэпіяна дзіцячай школы мастацтваў райцэнтра, упрыгожваў сваім вакалам і непасрэднай манерай выканання ўсе музычныя мерапрыемствы, якія праходзілі ў горадзе, — ці то невялічкі капуснік-канцэрт у сценах ДШМ, раённы баль выпускнікоў альбо святкаванне Дня Незалежнасці нашай краіны. А яшчэ — прадстаўляў Смалявіцкі раён і займаў ганаровыя месцы ў песенных конкурсах рознага ўзроўню — абласных, рэспубліканскіх, міжнародных...**



А між іншым, Улад з сям'і, якая не мае дачынення да музычнага мастацтва. І толькі прабабуля, Антаніна Уладзіміраўна Васілеўская, была выдатнай пявунняй, знакамітай на ўсю ваколіцу. Юнаку пашчасціла заспець яе жывой, і менавіта тыя калыханкі і прыпеўкі ўпершыню прыадчынілі яму дзверы ў чароўны свет народнай музычнай творчасці.

Ці марыў хлопчык аб вялікай сцэне — хто ведае... Але з захапленнем збіраў на свае імправізаваныя канцэрты сяброў, суседзяў і мінакоў, якія проста праходзілі паблізу. Аднойчы слухачамі такога вось канцэрта сталі Наталля Іванаўна Сташкевіч і Святлана Рыгораўна Гушчанская — дырэктар і мастацкі кіраўнік Дома культуры пасёлка Усяж. Менавіта Наталля Іванаўна пасля была першым музычным настаўнікам Уладзіслава.

А наступнай лагічнай прыступкай у музычнай адукацыі хлопчыка стала паступленне ў Смалявіцкую дзіцячую школу мастацтваў. Юнак з удзячнасцю гаворыць пра сваіх педагогаў — Надзею Навінскую, Наталлю Новікаву і Наталлю Іванаўну Шаблюк.

— Асабліва абавязаны я Наталлі Іванаўне Шаблюк. Яна — цудоўны харавы дырыжор, кіраўнік акадэмічнага хора. У ДШМ Наталля Іванаўна была выкладчыцай харавых дысцыплін і вакалу. Шмат часу працавалі мы з ёю над пастаноўкай голасу, правільным дыханнем... Менавіта яна дапамагла мне пераадолець вельмі складаны для хлопцаў перыяд мутацыі галасавых звязак у падлеткавым узросце. Дзякуючы ёй мой высокі дыскантператварыўся ў лірычны бас-барытон.

Улад прызнаецца, што і прафесію сабе ён выбраў па прыкладзе Наталлі Іванаўны. Пасля заканчэння сярэдняй і музычнай школ паступіў на факультэт музычнага мастацтва (кафедра харавога і вакальнага мастацтва) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пад кіраўніцтвам прафесара Альбіны Васілеўны Пякуцькі атрымаў спецыяльнасць «кіраўнік акадэмічнага хору, выкладчык музычных дысцыплін».

І падчас студэнцтва ва Уладзіслава, з яго актыўнай жыццёвай і творчай пазіцыяй, было ўсё — тыя ж конкурсы вакальнага майстэрства, удзел у тэатралізаваных музычных пастаноўках і іншых праектах, выступленні ў якасці вядучага на творчых вечарынах... Працягваў супрацоўнічаць з Домам культуры роднага пасёлка Усяж. Уладзіслаў Качан з'яўляўся кіраўніком дзіцячага эстраднага калектыву «Kastalia», які працаваў пры ДК. Ажыццявіў сваю даўнюю мару — выступіў з сольным канцэртам перад аднавяскоўцамі. Дарэчы сказаць, аўтарам слоў і музыкі да адной з песень, якія гучалі на канцэрце, з'яўляецца сам Уладзіслаў. Прысвечана яна, вядома, роднаму пасёлку.

Юнак гаворыць, што яму вельмі пашанцавала з людзьмі, якіх ён сустрэў у сваім жыцці. Усе дарослыя, якія знаходзіліся з ім побач, былі мудрыя, здольныя разгледзець талент, падтрымаць і не загубіць яго дзіцячую здольнасць марыць. І сям'я заўсёды падтрымлівала і цяпер падтрымлівае яго. У першую чаргу — бацькі, Людміла Уладзіміраўна і Андрэй Аляксандравіч. Бабуля, Ганна Ігнацьеўна Макавеева, швачка з вялікім вопытам, на працягу ўсяго часу шые для артыста канцэртныя касцюмы, займаецца яго прасоўваннем на розныя музычныя конкурсы. А ў ліку тых, хто прывіў Уладу любоў да эстраднай музыкі, была яго цётка, Кацярына Аляксандраўна Грынкевіч, салістка Дома культуры пасёлка Усяж. Прыслухоўваючыся да яе голасу, спявак шукаў асабістую манеру выканання. Улад прызнаецца, што без дапамогі ўсіх гэтых людзей ён бы не здолеў адшукаць сябе, стаць такім, якім ён ёсць сёння.

А сёння Уладзіслаў — выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, прафесійны спявак. Уладальнік лірычнага бас-барытона нядаўна прыступіў да работы ў праслаўленым калектыве — Акадэмічным ансамблі песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. А гэта значыць, што пачаўся новы перыяд у яго жыцці і творчасці.

Наперадзе ў юнака — прафесійная дзейнасць у складзе ансамбля. Яго чакаюць чарговыя конкурсы і фестывалі, новыя канцэртныя пляцоўкі, гастрольныя туры па новых гарадах і краінах... Поспехаў табе, Уладзіслаў!

**Паліна ПРАКАПЕНЯ.**

*У ліку найлепшых*

# Экзамен на мужнасць

## Яго пройдуць байцы праваахоўных атрадаў

**Сёння і заўтра найлепшыя прадстаўнікі маладзёжнага праваахоўнага руху БРСМ з усіх куткоў Беларусі возьмуць удзел у рэспубліканскай спартакіядзе для байцоў маладзёжных атрадаў ахровы правапарадку «Акадэмія мужнасці — 2017», якая адбудзецца ў Гродне. Тэарэтычныя і практычныя экзамены «Акадэміі мужнасці» здадуць аднгачасова больш за сто прадстаўнікоў руху — сем камандаў-пераможцаў абласных і Мінскага гарадскога этапаў спартакіяды.**

Упершыню праграма ўключае ў сябе праверку тэарэтычных ведаў у памочнікаў міліцыі і ратавальнікаў у частцы прававой і медыцынскай падрыхтоўкі, а таксама штогадовыя спартыўныя спаборніцтвы па перацягванні каната, жыме гіры, бегу на 100/1000 метраў, кіданні гранаты і стральбе з малакалібернай вінтоўкі. Па выніках выпрабаванняў будуць вызначаны пераможцы і прызёры ў камандным і асабістым заліках.

Па традыцыі спартакіяда стартуе з грамадзянска-патрыятычнай акцыі з ускладаннем вянкоў і кветак да мемарыяла міліцыянерам, што загінулі пры выкананні службовых абавязкаў у Гродне.

Адным з цэнтральных мерапрыемстваў спартакіяды стане адкрыты дыялог на тэму «Беларусь — краіна міру і парадку» з удзелам моладзі і экспертаў — прадстаўнікоў МУС, МНС, СК Рэспублікі Беларусь, выканаўчай і заканадаўчай улады.

Арганізатарамі спартакіяды выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пры падтрымцы міністэрстваў унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях, Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Рух маладзёжных атрадаў правапарадку (МААП) ГА «БРСМ» аб'ядноўвае больш як 15,5 тысячы юнакоў і дзяўчат ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Ён скіраваны на падрыхтоўку маладых людзей да службы ў войску, паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі сілавых структур. Яго ўдзельнікі актыўна дапамагаюць супрацоўнікам праваахоўных органаў і ратавальнікам у забеспячэнні грамадскага правапарадку ў гарадах і вёсках, а таксама навучанню грамадзян асновам бяспекі жыццядзейнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Запрашальнік*

# Якім бачаць горад будучыні школьнікі?

**Да 25 лістапада ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі будзе працаваць выстаўка найлепшых работ рэспубліканскага конкурсу дзіцячай творчасці «АрхНавацыя-2017», прысвечанага Году навукі. У яго заключным этапе прынялі ўдзел больш за 800 навучэнцаў устаноў адукацыі з усіх рэгіёнаў краіны.**

На выставе будзе прадстаўлена больш за 300 жывапісных і графічных работ, архітэктурныя макеты, мастацкія фатаграфіі ў намінацыях: «Жывапіс», «Графіка», «Мастацкая фатаграфія», «Архітэктурнае макетаванне».

Тэматыка работ: «Разумны горад», дзе адлюстраваны ўяўленні навучэнцаў аб ідэальнай архітэктурнай будучыні, раскрыты тэндэнцыі развіцця горадабудаўніцтва, мабільнасць і экалагічнасць горада; «Універсальны дызайн», у работах якога раскрыты творчыя ідэі навучэнцаў адносна стварэння безбар'ернага гарадскога асяроддзя; «Мінск — горад гісторыі і культуры», прысвечаны 950-годдзю сталіцы.

У рамках выстаўкі рэспубліканскага конкурсу дзіцячай творчасці «АрхНавацыя-2017» будуць арганізаваны экскурсіі «Горад будучыні».

Арганізатарамі конкурсу выступаюць Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі. Удзельнікі — навучэнцы аб'яднанняў па інтарэсах устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і іншых устаноў адукацыі ва ўзросце ад 4 да 20 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Запаліць «зорку»*

# Ад «пробы пяра» — да прафесіі

**Учора ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» пачалася змена «Прэс-перспектыва», у рамках якой адбудзецца падвядзенне вынікаў XIII Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі «Свежы вецер». Змена, якая будзе праходзіць па 14 лістапада, арганізавана для 220 юных журналістаў — вучняў 7—11 класаў, што працуюць у сферы аматарскага відэа, радыё, прэсы і інтэрнэт-блогаў.**

Да ўдзелу ў ёй запрошаны пераможцы адборачнага этапу XIII Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі «Свежы вецер», пераможцы рэспубліканскага фестывалю школьных друкаваных СМІ «Проба пяра», юныя карэспандэнты газет «Переходный возраст» і «Зорька». Партнёрамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства інфармацыі, Інстытут журналістыкі БДУ, газеты «Переходный возраст», «Зорька», «Звязда», часопіс «Народная асвета», Дом прэсы, Белтэлерадыёкампанія, Грамадскае нацыянальнае тэлебачанне, Сталічнае тэлебачанне, каналы радыё «Культура» і «Радыус FM».

І такая цікавасць да змен дзіцячых і маладзёжных СМІ невыпадковая. Дзіцячыя і маладзёжныя СМІ рэалізуюць шэраг навучальных, выхаваўчых, развіваючых задач, фарміруюць культуру стасункаў, стымулююць актыўнае ўключэнне навучэнцаў у інфармацыйную і адукацыйную прасторы, садзейнічаюць іх самарэалізацыі, арыентуюць на сацыяльна значную дзейнасць. Штогадовыя змены юных журналістаў з'яўляюцца падтрымкай аб'яднанняў па інтарэсах: клубаў, прэс-цэнтраў, студый і інш. Удзел моладзі ў рабоце дзіцячых прэс-цэнтраў па сутнасці з'яўляецца першым крокам на шляху да выбару будучай прафесіі.

Ідэя змены заключаецца ў стварэнні гульнявой мадэлі, максімальна набліжанай да рэальных умоў жыццядзейнасці журналістаў: работа рэдакцый, спецзаданні, «дэдлайн», крытыка, расследаванні і многа іншага. Да рэалізацыі ўсяго гэтага ў розных формах — творчыя сустрэчы, майстар-класы, сумесныя праекты, адукацыйныя экскурсіі ў тэле- і радыёстудыі, рэдакцыі — прыцягваюцца прафесіяналы сваёй справы.

Значнымі падзеямі гэтай змены будуць адкрыццё XIII Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі «Свежы вецер» (28 кастрычніка), дэбат-турнір «Праблема ў фокусе» (1, 3 і 7 лістапада), адукацыйны форум «Вектар на будучыню школьных СМІ, ці Прэс-перспектыва» (10 лістапада), «Дзень друкаваных СМІ ў "Зубраняці"» (11 лістапада), а таксама закрыццё змены (13 лістапада).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Свой доктар

# Слова і траўму лечыць

**...Аляксандр вывучае здымак і дае апошнія парады: «Нагу зараз толькі зялёнкай апрацоўваем і — бегаем! І чакаю фота на Viber, як зажывае». Мама і дзяўчынка ўсміхаюцца і спяшаюцца хутчэй дадому.**
**Загадчыка аддзялення траўматалогіі Смаргонскай ЦРБ Аляксандра МІХАЛЬКЕВІЧА добра ведаюць не толькі ў раёне, а яшчэ ў Ашмянах, Астраўцы.**
**— Наша аддзяленне — міжраённае, «густанаселенае», таму работы хапае. Як і адказнасці. Ды і мясцовыя, — усміхаецца малады ўрач.**



Працоўны дзень у Аляксандра пачынаецца з 7 раніцы: абход аддзялення, «пяціхвілінка», складанне плана на дзень. І пацыенты, пацыенты, пацыенты... Скончыцца ж усё можа і ў 8, і ў 10, а то і наступнай раніцай, калі экстраная аперацыя.

— У асноўным нам даводзіцца працаваць з траўмамі канечнасцяў. У маладых — рукі, у старэйшых — ногі. Як кажуць, чым старэйшы, тым бліжэй да пятак. Але адназначна ўсе беды — ад няўважлівасці. А яшчэ ад злоўжывання алкагольнымі напоямі. Кажуць, што пад градусам і мора па калена. Здаралася ў маёй практыцы, што сапраўды шанцавала такім. Я ж кажу: проста нарадзіўся ў кеўларавай кашулі.

— А часта сутыкаецеся з вельмі складанымі выпадкамі?

— Здараецца. Калі экстранная сітуацыя, то мы заўсёды на сувязі з Рэспубліканскім цэнтрам траўматалогіі і артапедыі: адсылаем па электроннай пошце ўсе абследаванні. Там заўсёды дапамогуць і словам, і справай. А для вельмі сур'ёзных пашкоджанняў — спіны, таза — выклікаецца служба спінальных хірургаў, яны дзяжураць па ўсёй краіне. У асноўным жа вырашаем усё на месцы.

Часам людзі не зусім разумеюць, што несвоечасовы зварот да ўрача нясе больш сур'ёзныя наступствы.

— Мы гэта назіраем штодня, — уздыхае Аляксандр. — Чалавек атрымлівае траўму рукі, і бачна, што трэба абавязкова паказацца спецыялісту, але не, — няма часу. Ды і «раптам пройдзе». Гэтае «раптам» нам потым цяжка вылечыць...

Ці, напрыклад, чым даўжэй стары ляжыць у ложку, тым большая верагоднасць, што будуць сур'ёзныя ўскладненні, якія могуць мець незваротныя наступствы.

— Нядаўна да мяне на прыём прыйшла бабуля 1928 года нараджэння, роўна праз месяц пасля траўмы, — працягвае ўрач. — З хадункамі, але сама! Поспех лячэння такіх пацыентаў залежыць ад іх настрою — калі яны байцы па жыцці, то бачна — пойдзе! Я ўсім кажу — гэта ваша здароўе! Вам жа самім хочацца не толькі дачакацца ўнукаў і праўнукаў, але і на вяселлі ў іх пагуляць? Для многіх бабуль гэта стымул. З іншага боку, калі прыходзіць пенсіянерка 80 гадоў з «мехам» паталогій, ты хочаш, ты ведаеш, што тэхнічна гэта магчыма, але арганізм не перажыве аперацыі, мы спрабуем лячыць кансерватыўна, таму што хірургічна ўжо позна... Застаецца прапісаць абязбольвальныя, парады даць, каб рухалася больш. Бабуля выходзіць і трохі ўсміхаецца ўжо, — дзеліцца Аляксандр. — Нездарма ж кажуць — доктар і словам лечыць.

Суразмоўнік сцвярджае, што пры ўсёй загружанасці і ненармаванасці яго работа — вельмі цікавая.

— Яна дае магчымасць пазнаваць новае, развіваць аддзяленне. Рабіць тое, што ты яшчэ не рабіў. Напрыклад, авалодаць новай методыкай, бо цяпер тэхналогіі ў траўматалогіі развіваюцца вельмі імкліва. Нездарма ж я хацеў у юнацтве займацца робататэхнікай — у некаторым сэнсе гэта цяпер і раблю.

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**
*begunkova@zviazda.by*

*Мінск — Смаргонь — Мінск.*

Крэатыў, на старт!

# У конкурса — сёмы сезон

100 твоих ИДЕЙ для БЕЛАРУСИ

## Сёлета ўдзельнікаў чакаюць новаўвядзенні

**Рэспубліканскі маладзёжны конкурс «100 ідэй для Беларусі», ідэйным натхняльнікам якога з 2011 года выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, стартуе ва ўсіх рэгіёнах краіны.**

На думку выконваючай абавязкі другога сакратара ЦК ГА «БРСМ», каардынатара маладзёжнага конкурсу Эліны Брагі, «100 ідэй для Беларусі» з'яўляецца базавым стартапам для развіцця нацыянальнага руху маладых навукоўцаў, вынаходнікаў, рацыяналізатараў. «Гэта выдатная магчымасць заявіць пра сябе на ўсю краіну, атрымаць дапамогу ў развіцці і суправаджэнні аўтарскага праекта, удзельнічаць у выстаўках і майстар-класах, набыць вопыт стасункаў з інвестарамі, прадпрымальнікамі, прадстаўнікамі розных фондаў», — упэўнена Эліна Брага.

Да ўдзелу ў новым сезоне конкурсу запрашаюцца маладыя людзі (калектывы аўтараў) ва ўзросце ад 14 да 31 года (маладыя навукоўцы да 35 гадоў): першая група — навучэнцы, курсанты ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі; другая група — студэнты, курсанты, слухачы ўстаноў вышэйшай адукацыі; трэцяя група — маладыя навукоўцы да 35 гадоў, працуючая моладзь.

З улікам Года навукі ў Рэспубліцы Беларусь колькасць намінацый конкурсу ўзрасла з дзесяці да дваццаці. Аднак кожнай групе прапануецца ўдзельнічаць выключна ў сваіх намінацыях. Напрыклад, першай групе — у намінацыях «Прыродазнаўча-навуковы кірунак» і «Сацыяльна-гуманітарны кірунак»; другой групе — «Медыцына, фармі біятэхналогіі»; «Новыя матэрыялы і тэхналогіі»; «Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, у тым ліку для людзей з інваліднасцю»; «Бяспека жыццядзейнасці і абараназдольнасць»; «Біяразнастайнасць, прыродакарыстанне і экалогія»; «Аграпрамысловыя тэхналогіі і вытворчасць»; «Сацыяльная сфера»; трэцяй групе ўдзельнікаў — у намінацыях: «Энергетыка і энергаэфектыўнасць, атамная энергетыка»; «Аграпрамысловыя тэхналогіі і вытворчасць»; «Прамысловыя і будаўнічыя тэхналогіі і вытворчасць»; «Медыцына, фармацыя, медыцынская тэхніка»; «Хімічныя тэхналогіі, нафтахімія»; «Бія- і нанаіндустрыі»; «Інфармацыйна-камунікацыйныя і авіякасмічныя тэхналогіі»; «Рацыянальнае прыродакарыстанне і глыбокая перапрацоўка прыродных рэсурсаў», «Нацыянальная бяспека і абараназдольнасць, абарона ад надзвычайных сітуацый»; «Сацыяльная сфера», «Інклюзіўная прастора».

З гэтага года на агульных падставах у любой групе і намінацыі могуць прыняць удзел людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

Новы сезон конкурсу «100 ідэй для Беларусі» пройдзе ў тры этапы: першы — прыём заявак на месцах; другі — адбор заявак на абласным (мінскім гарадскім) узроўнях, і трэці, фінальны — штогадовая маладзёжная выстаўка-прэзентацыя найлепшых інавацыйных і навукова-тэхнічных праектаў «100 ідэй для Беларусі» ў фармаце шоу-тэхналогій.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе можна накіроўваць у тэрытарыяльныя камітэты БРСМ, а таксама праз запаўненне анлайн-заяўкі на сайце конкурсу 100ideas.by. Усе заяўленыя праекты плануецца змясціць у «банк ідэй» на афіцыйным інтэрнэт-рэсурсе 100ideas.by, а таксама ў групах конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ў сацыяльных сетках «УКантакце», Twitter, Instagram.

Для правядзення конкурсу створаны абласныя (Мінскі гарадскі) і рэспубліканскі экспертныя Саветы. У склад апошняга ўваходзяць прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, навукі, профільных суб'ектаў гаспадарання, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў», прадстаўнікі бізнессупольнасцяў, Савета маладых прадпрымальнікаў пры ЦК БРСМ, фізічныя асобы і інш. Эксперты ацэняць не толькі актуальнасць і навізну ідэі, але і практычную значнасць работы, а таксама рэальнасць рэалізацыі конкурснага інавацыйнага праекта.

Дарэчы, аўтары-пераможцы фінальнага этапу конкурсу атрымаюць пуцёўкі на ўдзел у міжнародным маладзёжным конкурсе дзяржаў — удзельніц СНД «100 ідэй для СНД 2018», правядзенне якога запланавана ў Мінску.

Акрамя таго, пераможцам першай групы будуць уручаны рэкамендацыі Цэнтральнага камітэта БРСМ для паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі на спецыяльнасці, адпаведныя профілю іх конкурснага праекта.

Пераможцы другой групы атрымаюць запрашэнне прайсці школу «Малады навуковец пад ключ» пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Усе фіналісты конкурсу «100 ідэй для Беларусі» адначасова прымаюць удзел у Рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў. На падставе рашэння савета рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў дзесяць аўтараў праектаў-пераможцаў гарантавана атрымаюць грашовыя сродкі ў памеры да 40 тарыфных ставак для распрацоўкі бізнес-планаў інавацыйных праектаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «СТАНЦАВАЦЬ АД ПЕЧКІ»...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Практыку вядзе **майстар Веніямін ЯРУСАЎ** — пячнік з 15-гадовым стажам.

— У мяне бацька таксама пячнік, — расказвае Веніямін Мікалаевіч пра тое, як прыйшоў у прафесію. — А я па спецыяльнасці муляр. Працаваў у асноўным «на катэджах», а пасля таго, як адзін з заказчыкаў папрасіў зрабіць камін, вырашыў асвоіць і іншы род дзейнасці. Цяпер перадаю сакрэты вучням. Ці пашлі па маіх слядах дзеці? А ў мяне дочкі, ім гэтыя навыкі не патрэбныя.

Хоць на курсы запісваюцца і дзяўчаты — за ўсе гады іх было чалавек сем.

Майстар расказвае пра тэхналогію будаўніцтва печы. Спярша робіцца разметка: на сцяне — пачынаючы зверху — малюецца контур. Пасля збіраецца непасрэдна канструкцыя. На ўкладку адной печы ідзе ў сярэднім 7—10 дзён і каля тысячы цаглін. «На іх не павінна быць трэшчын, — дае парады па выбары матэрыялу Веніямін Мікалаевіч. — З інструментаў раней былі патрэбныя малаток, адвес і кельма. А цяпер у арсенале майстроў і адразныя машынкі, і лобзікі — у мяне ўвесь багажнік забіты».

Ёсць мноства разнавіднасцяў печаў: з плітой, з ляжанкай, каміны. Руская, напрыклад, лепш падыходзіць для гатавання, а «галандка» — для абагрэву памяшкання. Але цяпер часцей замаўляюць барбекю.

— У нашай прафесіі патрэбна не толькі веданне тэхналогіі, але і фантазія. Усе хочуць, каб печ была прыгожая. Чым лепш зробіш, тым ахвотней табе заплацяць, — усміхаецца майстар.

Добра складзеная печ можа прастаяць больш за 50 гадоў. Але каб яна праслужыла доўга, прапальваць трэба рэгулярна. «Многія гаспадары прыязджаюць у вёску ў пятніцу ўвечары і хочуць, каб у хаце адразу стала цёпла. А такога ж не бывае. У выніку печ пераграваюць, і яна лопаецца. У сябе на лецішчы я паставіў невялікую дадатковую металічную печку: яна праз паўгадзіны ўжо дае цяпло, пакуль асноўная паступова разгарaецца», — дзеліцца карысным досведам Веніямін Мікалаевіч.

## РАМЯСТВА З ПРЫЦЭЛАМ

У майстэрні, дзе праходзяць практычныя заняткі, паступова збіраюцца вучні. У воблаку пылу яны складаюць свае першыя печы. Замест глінянага раствору выкарыстоўваюць мокры пясок, каб потым лягчэй было разбіраць канструкцыю.

У многіх наведвальнікаў курсаў ёсць вышэйшая адукацыя. 29-гадовы Сяргей Сарокін, напрыклад, скончыў



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**Майстар Веніямін Ярусаў паказвае партфоліа са сваімі работамі.**

Ваенную акадэмію. Капітан запасу. Але ў цяперашні момант не працуе, таму і вырашыў асвоіць дадатковую спецыяльнасць.

— Па-першае, валодаць рамяством ніколі не перашкодзіць. Па-другое, мая цешча ў Браславе пабудавала домік, збіраецца заняцца агратурызмам. Ужо два заказы на печкі будуць вясной, — тлумачыць Сяргей.

У будучым ён збіраецца аднавіцца ў сілавых структурах, але, калі што, смяецца, без работы ўжо не застанецца.

Менеджар па продажах Антон Картыннік прыехаў на заняткі адразу пасля працоўнага дня. У 28-гадовага хлопца ёсць вышэйшая тэхнічная адукацыя, а будаўніцтва для яго — хобі. «Печку буду класці на лецішчы, — дзеліцца планамі. — У лазні старая стаіць, трэба памяняць. Ці складана гэтаму вучыцца? Калі ёсць задаткі, то не. Я люблю будаваць».

А вось Яўген Лексін яшчэ студэнт. Вучыцца ў гэтым жа ліцэі на сталяра.

— Не шкадую, што запісаўся на курсы. У будучым хачу дамы будаваць, таму ўменне складаць печы спатрэбіцца. Пакуль складана, але стараюся.

— На курсах будучыя печнікі знаёмяцца, аб'ядноўваюцца ў брыгады, — заўважае майстар Веніямін Ярусаў. — Самае галоўнае для хлопцаў — пераадолець страх. Трэба пасля навучання хутчэй прыступіць да работы, не адцягваць гэты момант. Першая печ, вядома, ідэальнай не атрымаецца, але, як наб'юць руку, будуць добрымі майстрамі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

*Даходныя ўражанні*

# ЗА «ДОЎГІМ» ЮАНЕМ,

## або На заробкі — у Кітай

**Зарабіць свае першыя грошы — мара амаль кожнага школьніка, а тым больш студэнта. Але калі большасць дзеля гэтага імкнецца ўладкавацца на лета ў будаўнічыя атрады, дык некаторыя маладыя людзі выпраўляюцца на заробак у... Кітай.**

**Прапаноў у сеціве зашмат: патрабуюцца перакладчыкі, танцоры, афіцыянты. З вопытам работы і без. Цяжка не разгубіцца і абраць фірму, якой можна давяраць. Мы сустрэліся з дзвюма дзяўчатамі, якія паспяхова з'ездзілі ў Кітай і вярнуліся з салідным «уловам».**



Незабыўныя ўражанні пакінула вандроўка ў горы.

### Ад парку забаў...

Яўгенія Тумель патрапіла ў Паднябесную пасля 9 класа. Дзяўчына ўжо шмат гадоў прафесійна займалася сінхронным плаваннем і на той момант была кандыдатам у майстры спорту. Трэнер каманды прапанавала паехаць на лета на заробкі з шоу-праграмай — усе згадзіліся.

Гэта быў не першы такі вопыт. Пасля 8-га класа спартсменкі ўжо працавалі ў Турцыі, таму Яўгеніі было з чым параўноўваць:

— У плане арганізацыі — усё добра, але сярод іншых краін Турцыя лічыцца самай нізкааплатнай. Мы жылі ў гатэлі, вялі аэробіку ў басейне і выступалі ўвечары. Знаёмыя ездзілі так працаваць у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — там плацяць лепш, але даводзіцца ўвесь час хадзіць у паранджы і плаваць у гідракасцюме: ад шыі да шчыкалатак усё закрытае.

Каб трапіць на работу ў Кітай, трэба было зрабіць шмат даведак, запоўніць анкету, даслаць свае фотаздымкі і відэа з падрыхтаванымі нумарамі. Разам з візай рабілі і від на жыхарства.

— Патрабуюць, напрыклад, дыплом аб педагагічнай адукацыі, калі едзеш працаваць з дзецьмі, ці сертыфікат аб праходжанні курсаў аніматара. Калі не выконваеш нейкія ўмовы кантракта, могуць адправіць дадому без білета.

Яўгенія з камандай жыла пад Пекінам, выступалі ў парку забаў. Ён размешчаны на некалькіх астравах: там і жылі, і працавалі. На выхадныя ездзілі ў горад на пакупкі ці



Краявід у горадзе Іу.

на экскурсіі. Але такіх вольных дзён было няшмат.

У Кітаі сезон для прыезджых работнікаў доўжыцца з мая па кастрычнік. Кантракты ў асноўным заключаюцца працягласцю ад двух да шасці месяцаў. Сярэдні заробак складае 1000 — 1500 долараў у месяц. Многія работадаўцы да таго ж аплачваюць жыллё, харчаванне, пералёт і афармленне дакументаў.

— Мы жылі ў пакоі ўдваіх. На стале быў пастаянна рыс, якім не наясіся, але потым уцягнуліся. Нас прасілі няшмат загараць, таму што светлая скура лічыцца ў Кітаі вельмі прыгожай.

### ...да начных клубаў

Яўгенія Булычова ездзіла на заробкі падчас навучання ва ўніверсітэце. Два гады таму, датэрмінова здаўшы летнюю сесію, яна адправілася ў горад Іу, які знаходзіцца на паўднёвым усходзе Кітая.

— Першапачаткова мы думалі паехаць з сябрам. Запланавалі парную праграму па сучасным танцы, па хіп-хопе. Але амаль у апошні момант у яго не атрымалася, а з сольнікам я ехаць не хацела. Ужо апусціла рукі ў пошуках новага партнёра. І тут ва ўніверсітэце сустрэлася з дзяўчынай, якая таксама танцуе, і мы вырашылі ехаць разам.

Горад Іу — адзін з бізнес-цэнтраў Кітая. Там знаходзіцца самы вялікі аптовы рынак у свеце. Іншаземцаў шмат — прыязджаюць зарабляць грошы, шукаць новых партнёраў і гандляваць.

— Мы паказвалі сваю праграму ў клубе, таму выступалі заўсёды ноччу. Але з-за розніцы ў часе атрымлівалася, што наша работа заканчвалася ў 24 гадзіны па мінскім часе, таму рытм жыцця асабліва не збіўся. Часам днём працавалі на карпаратывах. Ездзілі ў горы. Вельмі крута! Былі ў суседнім горадзе, бачылі, як у старых кітайскіх храмах жывуць манахі. Там нават фатаграфаваць нельга.

Яўгенія гаворыць, што ў асноўным танцаваць прыязджаюць іншаземцы. Шмат расіян і ўкраінцаў. Славянская знешнасць і незвычайныя для нацыянальнай культуры нумары прыцягваюць публіку і ствараюць моцную канкурэнцыю мясцовым артыстам.

### Галоўнае — ваша бяспека

У выніку абедзве вандроўкі скончыліся добра і дзяўчаты засталіся задаволеныя. А для тых, хто захоча разнастаіць свае канікулы, яны далі некалькі парад.

Па-першае, лепш за ўсё не ехаць на заробак аднаму. Паколькі паездка даволі працяглая, не ўсё можа прайсці гладка. Сарыентавацца ў незнаёмай краіне будзе куды прасцей з сябрам.

Па-другое, падрыхтуйцеся. Падцягніце замежную мову, высветліце асаблівасці культуры іншай краіны. Добра, калі вы будзеце ведаць нюансы афармлення працоўнай візы, а таксама адкладзяце грошы на рэйс дадому. Гэта дасць гарантыю, што вы зможаце самастойна вырашыць праблемы, калі тыя раптам узнікнуць.

І галоўнае — пільна выбірайце свайго работадаўца. Як правіла, ёсць менеджар з Беларусі, які шукае людзей, і непасрэдны кіраўнік у Кітаі. Першы ўладкоўвае на работу і, часцей за ўсё, едзе разам з вамі. Ён дапамагае рыхтаваць усе неабходныя дакументы. Будзе карысна знайсці водгукі ад людзей, якія з ім ужо падарожнічалі. Акрамя гэтага, у Беларусі працуе бясплатная інфалінія па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой. Калі вы сумняваецеся ў сапраўднасці кантракта ці добрасумленнасці фірмы, лепш пракансультуйцеся ў спецыяліста.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*



У такіх храмах жывуць кітайскія манахі.

*З першых вуснаў*

# ПАМІЖ «НЕВЯЛІКІМІ» ГАРАДАМІ

**Кажуць, што чужая душа — загадка. Але часам хочацца даведацца, што ўяўляе сабой пэўны чалавек, пра што ён думае, чым жыве. Складаней за ўсё зразумець людзей з далёкага замежжа: у іх свае менталітэт, культура, лад жыцця. З іншага боку, стасункі з замежнікамі, якія прыязджаюць у Беларусь, — гэта карысны досвед, магчымасць даведацца штосьці адметнае пра іх краіны з першых вуснаў.**



Кітаянка Сыюй Ло вучылася ў Інстытуце журналістыкі БДУ тры гады па абмене. Жыла ў інтэрнаце Студэнцкай вёскі і вярталася на радзіму толькі ўлетку, на канікулах... Свой горад Цзылінь дзяўчына параўноўвае з Мінскам, называючы абодва... невялікімі. Кожны беларус мае права здзівіцца, бо наша сталіца — самы вялікі горад краіны. Але кітаянка бачыла Пекін і Шанхай, дзе колькасць насельніцтва — большая ў дзесяць разоў. Таму не параўнанне цалкам абгрунтаванае.

Сыюй — другое дзіця ў сям'і. Калі яна з'явілася на свет, яшчэ дзейнічала палітыка «адна сям'я — адно дзіця». Таму пасля яе нараджэння бацькі заплацілі вялікі штраф. У канцы 2015 года гэтая палітыка была адменена... Цяпер мама і тата Сыюй займаюцца бізнесам, прадаюць ювелірныя ўпрыгажэнні. Адпраўляючы дачку ў Беларусь, яе маці зрабіла некалькі бранзалетаў, каб яна падаравала іх беларускім сябрам. Упрыгажэнні, сплеценыя з чырвоных нітак (гэты колер прыносіць шчасце), аздоблены каштоўнымі камянямі. На іх намаляваны сімвалы здароўя, моцы, энергіі.

...І вось яна, сінявокая Беларусь, невялікі для Сыюй Мінск! Незнаёмыя людзі, чужая мова... Некалькі сказаў па-руску дзяўчына вывучыла ў Кітаі. Потым засвойвала мову на нашым журфаку. Ёй было вельмі складана, таму што выкладчык тлумачыла ўсё на рускай, якой яна не ведала. Кітаянка часта блытала назвы, напрыклад, замест шампуню купляла гель для душу. Цяжкасці ўзнікалі не толькі з мовай. Без інтэрнэту Сыюй і дагэтуль складана арыентавацца ў маршрутах наземнага транспарту: на прыпынках няма поўнай схемы, толькі час прыбыцця. А вось у метро — ніякіх праблем. Нягледзячы на тое, што прыпынкі аб'яўляліся раней толькі на беларускай мове, кітаянка проста запомніла іх назвы. Усяго ж дзве лініі, у той час як у Пекіне іх — цэлых дваццаць!

У Беларусі Сыюй даволі ся прызвычайвацца ў да нашай ежы. Увогуле, калі толькі прыехала, ёй шмат што не падабалася. Але густы змяніліся. Цяпер яна любіць звыклыя для нас дранікі. Хоць і ў Кітаі ёсць падобная страва — бліны з бульбы. Таксама яна палюбіла салянку і гуляш. А яшчэ смятану. Яна прадаецца і на радзіме, у спецыяльных аддзелах для замежных прадуктаў, але большасці кітайцаў гэты прадукт не падабаецца. Сыюй таксама не любіла, а цяпер з задавальненнем дадае смятану ў боршч.

У Кітаі дзяўчына сама не гатуе, як і яе бацькі, бо значна танней заказваць ежу з рэстарана. А вось у інтэрнаце, калі быў час і жаданне, магла пастаяць каля пліты. «У беларускіх крамах не заўсёды можна знайсці патрэбныя прадукты для нашых страў. Напрыклад, у Кітаі вельмі шмат рознай гародніны,» — расказвае Сыюй.

Акрамя гатавання, у вольны час дзяўчына глядзела фільмы, хадзіла ў госці, гуляла з сябрамі па Мінску. За тры гады паспела павандраваць і па Беларусі: Брэст, Полацк, Мір, Нясвіж, Гродна... Дзяліцца ўражаннямі: «Мне вельмі спадабалася Брэсцкая крэпасць, я нават трапіла на рэпетыцыю парада да Дня Перамогі».

Сёлета Сыюй закончыла вучобу на журфаку і паступіла ў магістратуру лінгвістычнага ўніверсітэта, каб больш дасканала вывучыць рускую мову. Пасля — работа ў Кітаі, бо ў Мінску, на яе погляд, нізкі заробак. «У Пекіне сярэдні заробак — тысяча дзвесце долараў. Хоць для такога вялікага горада гэта не вельмі шмат: добрае жыллё дарагое, асабліва ў цэнтры, недзе трыста долараў у месяц. Шанхай мне падабаецца больш. Гэта чысты і сучасны горад...», — тлумачыць дзяўчына.

Знаёмства з Сыюй пацвердзіла маё назіранне: кітайцы — вельмі дружалюбныя і прыязныя. А беларусы адметныя сваёй гасціннасцю і дабрынёй. І гэта яднае нас з замежнікамі.

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка III курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

*З ліку ахвотных*

## На гульні, як на працу

**Валанцёрства — гэта не толькі магчымасць аддаць часцінку сябе, аказаўшы дапамогу тым, хто мае ў ёй патрэбу, але часам і цікавыя вандроўкі. Напрыклад, на маючыя адбыцца ў 2019 годзе II Еўрапейскія гульні паступаюць заяўкі не толькі ад беларусаў, але і ад замежнікаў.**

У ліку апошніх шмат расіян, ёсць вопытныя валанцёры з Вялікабрытаніі, Румыніі і нават адзін ахвотны з Сінгапура. Усяго ўжо пададзена больш за 1,5 тысячы заявак. А прыцягнуць у якасці валанцёраў падчас II Еўрапейскіх гульняў плануецца больш за шэсць тысяч добраахвотнікаў. Зразумела, што большасць з іх складуць камунікабельныя студэнты і навучэнцы айчынных устаноў адукацыі, якія валодаюць англійскай мовай. Менавіта яны стануць асноўнымі памочнікамі падчас правядзення гульняў. Іх удзел у спартыўным мерапрыемстве такога ўзроўню таксама ў пэўным сэнсе можна назваць вялікім падарожжам: па досвед, новыя знаёмствы і ўражанні, бо валанцёры будуць задзейнічаны прыкладна на дваццаці кірунках. Гэта работа са сродкамі масавай інфармацыі, допінг-кантроль, медыцынскае абслугоўванне, дапамога ў размяшчэнні гасцей і спартсменаў і іншае.

Падаць сваю кандыдатуру на ўдзел у II Еўрапейскіх гульнях у складзе дружнай каманды валанцёраў можна на сайце Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Извещение о проведении 28 ноября 2017 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

Сведения о продаваемом имуществе:

| Номер предмета торгов | Информация о предмете торгов | Начальная цена, руб. с НДС | Размер задатка, руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ-3302 (грузовой бортовой тентовый) инв. №3246, рег. знак AI 1967-3, год выпуска – 2008. Место нахождения: Гомельская обл., г. Гомель. Кузов №33020080536053, X9633020082332629 | 2048,00 | 204,80 |
| 2 | Автомобиль ВАЗ-21150 (легковой седан) инв. №4422, рег. знак 6417 НН, год выпуска – 2001. Место нахождения: Гомельская обл., г. Буда-Кошелево. Кузов №XTA21150023095782 | 600,00 | 60,00 |
| 3 | Капитальное строение блок гаражей инв.№ 340/С-306874, площадь 141,2 кв. м по адресу: Гомельская обл., г. Речица, ул. Луначарского, 7/1. Земельный участок, кадастровый №324550100001000045, площадью 0,3278 га; назначение участка – земельный участок для обслуживания гаражей | 33600,00 | 3 360,00 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.

Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» №BY32BAPB30122013100180000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код 153001964, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 28 ноября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах, осуществляются с 27.10.2017 по 27.10.2017 включительно в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.torgi.agroconsult.by, mail: torgi@agroconsult.by

Телефоны для справок Филиал ОАО «Белагропромбанк» – Гомельское областное управление, Специалист отдела обеспечения деятельности банка Баркова Анастасия Владимировна, тел. 8 (0232) 79-26-90. Организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM VEL 8 (029) 816-64-46, GSM MTS 8 (044) 540-64-46

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ СП «ВЕСТАВТО» ОАО

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ №1: объект недвижимости 1.** Капитальное строение (инв. №100/С-44296) – санузлы, пл. 180,0 м², расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 17И; **объект недвижимости 2.** Капитальное строение (инв. №100/С-84875) – навес таможенного досмотра, пл. 514,7 м², расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 17И/1. Обекты расположены на земельном участке пл. 0,5915 га с кадастровым номером 140100000001029935 | **61 736,00** | **2 496,00** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 9 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: (0162) 20-92-13 ; 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 8 ноября 2017 г. до 17.00**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже административных помещений, находящихся в здании 1917 г. п., расположенном по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, принадлежащих ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ №91»

| № лота | Описание | Начальная цена продажи с учетом НДС 20%, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Административное помещение с инв. №500/D-708004818. Этаж – 3-й. Общая площадь – 35,2 кв. м | 50 040,00 | 5 004,00 | 10 |
| **Лот №2** | Административное помещение с инв. №500/D-708004817. Этаж – 3-й. Общая площадь – 52 кв. м | 68 112,00 | 6 811,20 | 10 |

Земельные участки для лотов №№1–2 будут сформированы к моменту подписания договора купли-продажи. Изолированные помещения расположены в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия

Аукцион состоится **13.11.2017 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Продавец: ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ №91» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, тел. 8 (017) 200-63-32.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, каб. 7, тел. 8 (017) 306-00-57.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 09.11.2017 в 11.00.

Задаток перечисляется: на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк»,г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже административных помещений (Лот №__), принадлежащих ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ №91», проводимом 13 ноября 2017 г.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.02.2017

**Контактная информация организатора аукциона • 8 (017) 306-00-57 • 8 (029) 356-90-03 • 8 (029) 550-09-52 • torgi@ino.by**

## БПС-СБЕРБАНК

**Уважаемые клиенты!**

С 26.10.2017 ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов **по действующим договорам в российских рублях:**

1. по заключенным до 01.04.2016 договорам срочного банковского депозита «Сохраняй» («старая» линейка депозитов):

| Сумма первоначального взноса | Размер процентов (годовых) | | |
|---|---|---|---|
| | 90-369 дней | 370-500 дней | 501-1000 дней |
| от 3 000 – 150 000 RUB | 5,4 | 5,8 | 6,2 |
| от 150 000 RUB | 5,6 | 6,0 | 6,4 |

2. по заключенным до 01.04.2016 договорам срочного банковского депозита «Пополняй» («старая» линейка депозитов):

| Сумма первоначального взноса | Размер процентов (годовых) | | |
|---|---|---|---|
| | 90-369 дней | 370-500 дней | 501-1000 дней |
| от 3 000 – 150 000 RUB | 5,2 | 5,6 | 6,0 |
| от 150 000 RUB | 5,4 | 5,8 | 6,2 |

3. по заключенным до 01.04.2016 договорам срочного банковского депозита «Управляй» («старая» линейка депозитов):

| Размер неснижаемого остатка | Размер процентов (годовых) | | |
|---|---|---|---|
| | 90-369 дней | 370-500 дней | 501-1000 дней |
| 15 000 RUB | 4,5 | 4,9 | 5,3 |
| 30 000 RUB | | | |
| 150 000 RUB | | | |
| 600 000 RUB | 4,7 | 5,1 | 5,5 |

4. по заключенным до 01.04.2016 договорам срочного банковского депозита «Безотзывный» («старая» линейка депозитов):

| Сумма первоначального взноса | Размер процентов (годовых) | | |
|---|---|---|---|
| | 90-369 дней | 370-500 дней | 501-1000 дней |
| от 7 000 – 350 000 RUB | 5,4 | 5,8 | 6,2 |
| от 350 000 RUB | 5,6 | 6,0 | 6,4 |

Установленный пунктами 1 – 4. размер процентов будет применен к депозитам с 26.11.2017.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

## Извещение о проведении 8 ноября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | – «лит.А1-2/к-кп, здание прачечной» общей площадью 1012 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-34660; назначение: здание неустановленного назначения) с элементами благоустройства: автодорога (540 кв. м), площадка под автостоянки (240 кв. м), пешеходная дорожка (206 кв. м), площадка под мусоросборник (4 кв. м), площадка (3 кв. м), бордюр 0,16 (40 кв. м, 251,22 п. м.), ограждение территории (16,40 п. м.), ограждение площадки под мусоросборник (5,50 п. м.), ворота (4,40 м. п.), ворота (7,60 п. м.); – электросети КЛ-0,4КВ (инвентарный номер по бухгалтерскому учету 3000842) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Кабушкина, д. 64 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,3900 га, кадастровый номер 500000000002001769, назначение – эксплуатация и обслуживание здания прачечной |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 598 878,45 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 59 000,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов (покупатель) обязуется согласовать дальнейшее функциональное назначение использования приобретенного объекта недвижимости с Минским городским исполнительным комитетом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 года №165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации» |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 8 ноября 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.10.2017 по 04.11.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. Кировске 30 ноября 2017 года

**Аукцион состоится 30 ноября 2017 года в 10.00 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 1-й этаж, зал заседаний**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Целевое назначение земельного участка (назначение в соответствии с единой классификацией) | Кадастровый номер | Стоимость документации (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| №1 | **г. Кировск, ул. Кирова, центральный рынок** | 0,0048 | 25 лет | **Установка и обслуживание торгового павильона (код 1 16 03)** | 722550100001003235 | 1988,34 | 242,51 | 48,50 |

**Принимать участие в аукционе имеют право граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.**

При оформлении заявления и соглашения о правах, обязанностях и ответственности сторон желающими принять участие в аукционе представляются **паспорт**, а также следующие документы: документ, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков**) на расчетный счет главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Могилевской области №BY76-AKBB36007170000180000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 700451296 (разовый платеж), **с отметкой банка**; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. **Консолидированными участниками** для участия в аукционе представляется также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. Уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет доверенности, выданные гражданами, индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Информация:

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

3) Условие предоставления земельного участка в аренду: в двухмесячный срок со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок получить разрешение на установку торгового павильона, приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня государственной регистрации победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона права аренды этим участком.

4) Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с лотовой документацией всем желающим.

5) **Победитель** аукциона либо **единственный участник** несостоявшегося аукциона **обязан** в течение **10 рабочих дней** со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся **внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, оплатить расходы по публикации извещения в средствах массовой информации и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

6) В предусмотренных законодательством случаях участниками аукциона уплачиваются штрафы: до 100 базовых величин (начальная цена предмета аукциона менее 500 базовых величин). Конкретные размеры штрафов прописываются в соглашениях о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключаемых с участниками аукциона.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (землеустроительная служба Кировского райисполкома) по адресу: **г. Кировск, ул. Пушкинская, 21а, каб. 6** в рабочие дни с даты опубликования извещения с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

**Последний день приема заявлений – 28.10.2017 года до 17.00.**

**Контактный телефон в г. Кировске – (8-02237) 24-8-57**

*Каля алімпійскага агню*

# ФЕСТЫВАЛЬ СА СПАРТЫЎНЫМ УХІЛАМ

**На цэлы тыдзень увесь свет сціснуўся да памеру Алімпійскага парка. Кантыненты сышліся ў Сочы: больш за 25 тысяч чалавек са 180 краін прыехала на XIX Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў, каб абмяняцца ідэямі, зірнуць на глабальныя пытанні ўсяго чалавецтва і пастарацца знайсці на іх адказы.**



Праграма мерапрыемства была напоўнена абмеркаваннямі культурных і навуковых тэм. Не абмінулі і высокія тэхналогіі, аўтаматызацыю прафесій. І, здаецца, не было таго, што не паспелі закрануць за фестывальны тыдзень. Засвоіць такую колькасць інфармацыі без належнага расслаблення цяжка. Але арганізатары прадумалі і гэта. У распараджэнне ўсіх удзельнікаў выдзелілі вялікую пляцоўку для спартыўных і экстрэмальных дысцыплін. Пра тое, як можна было здаць спартыўныя нарматывы, заняцца адразу некалькімі відамі баявых мастацтваў у адзін дзень, падрабязней у матэрыяле нашага карэспандэнта.

На фестывалі пастаянна праходзілі сяброўскія спартыўныя мерапрыемствы. Так, усе ахвотныя маглі паўдзельнічаць у забегу-2017 на трасе «Формулы-1», на якім была і генеральны прадзюсар «Матч ТБ» Ціна Кандэлакі. Яна адправілася туды адразу са сцэны. Практычна кожны дзень удзельнікі фестывалю здавалі нарматывы ГПА і атрымлівалі памятныя прызы. Для гэтага трэба было выбраць пяць «страў з меню», у якое ўваходзілі адціскanні, падцягванні, прэс, штуршок гіры, скачкі ў даўжыню і іншыя. Прычым маглі гэта зрабіць і дзяўчаты, і хлопцы любога ўзроўню падрыхтоўкі.

Таксама на мерапрыемстве працавалі і пляцоўкі для экстрэмальных відаў спорту. Калі вы любіце ВМХ, ролікавыя канькі або скейтборд, вам пэўна трэба было ісці сюды. Усім ахвотным давалася экіпіроўка і месца на рампе. Аматары футбола маглі сабраць сваю каманду і паўдзельнічаць у сяброўскім міжнародным турніры. І гэта самыя прыкметныя, але далёка не ўсе спартыўныя мерапрыемствы, якімі быў напоўнены фестываль. Удзельнічаць можна было ў кожным без перапынку, у адзін за адным. Без перабольшання — Алімпіяда актыўна адпачывала.

На працягу фестывальнага тыдня кожны дзень праходзілі і трэнінгі па баявых мастацтвах. Прычым узровень складанасці трэніровак тут сапраўды быў індывідуальны. Калі аматар і пачатковец — вас вучылі рухацца і паказвалі асновы. Калі вы ўжо ў тэме — дэманстравалі складаныя звязкі ўдараў і логіку вядзення паядынку. Мне пашанцавала паўдзельнічаць у майстар-класе па кікбоксінгу ад заслужанага майстра спорту, шматразовага чэмпіёна Расіі, СНД, Еўропы і свету Руслана Тазліяна. Магу адзначыць, што трэніроўка выйшла дынамічная. Руслан Тазліян пазней сказаў, што яшчэ дзень таму ён паказваў больш простыя рэчы, але потым заўважыў: публіка сабралася падрыхтаваная, і ёй трэба было нешта паскладаней. «Я планаваў паглыбіцца і даць камбінацыі прафесійнага ўзроўню, якія выкарыстоўваю сам. Гэты фестываль для мяне — унікальная магчымасць паказаць моладзі ўсяго свету, што такое кікбоксінг. Акрамя таго на фестывалі ёсць самыя разнастайныя кірункі айкідо, каратэ, самба, якія цікавыя мне як прафесіяналу. Тут мы дзелімся і атрымліваем новы вопыт. У сяброўскай атмасферы развіваемся і развіваем іншых», — растлумачыў Руслан Тазліян.

У канцы тыдня прайшоў фестываль баявых мастацтваў. Майстры і іх вучні 13 відаў усходніх і спрадвечна рускіх відаў адзінаборстваў сустрэліся на адным татамі насупраць Алімпійскага агню і паказалі ўсё, на што здольныя. Сіла духу і гармонія ішлі да гледачоў ад спартсменаў з усіх краін свету. Гэтыя эмоцыі падкрэслівалі агульныя панацыі фестывалю — аб'яднанне, разуменне і ўзаемапавага.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

*Нешта сабе!*

# «СПАДЗЯЁМСЯ ТОЛЬКІ НА ДУЖАСЦЬ РУК...»

## У вясковай школе энтузіястамі створаны адзіны ў раёне скаладром

**«Я зрабіла гэта! Паглядзіце! У мяне атрымалася!» — часта чуецца са спартыўнай залы Турэцкага дзіцячага садка—базавай школы, што на Чэрвеньшчыне. Тут дзеці займаюцца не толькі фізкультурай, але і... скалалажаннем! Такім нязвыклым для Беларусі, можна нават сказаць, элітным відам спорту.**



Сценка, рознакаляровыя зачэпы, мудрагелістыя маршруты (трасы) — тое, што патрэбна для аб'яднання па інтарэсах «Скалалажанне». Усё пачало майстравацца амаль тры гады таму на чыстым энтузіязме дырэктара школы Антаніны Даўгалявец і настаўніка фізкультуры Уладзіміра Кірыльчыка. Дапамагалі ім і вучні з бацькамі.

— Упершыню мы ўбачылі скаладром у адной са школ Мар'інай Горкі, — расказвае Антаніна Даўгалявец. — Там гэтым відам спорту займаюцца ўжо каля дзесяці гадоў. Мы былі ў такім захапленні, што вырашылі зрабіць сваю залу. Частку грошай на гэта ўзялі з бюджэту школы. Астатняе знаходзілі самі: дома, у суседзяў, сяброў. Хтосьці кавалак фанеры прынясе, хтосьці — фарбу. Усё будавалі сваімі рукамі, не лічачыся з часам.

Нарэшце ў лютым 2015 года адкрыўся першы і адзіны ў Чэрвеньскім раёне гурток па скалалажанні. Школьнікам паказвалі майстар-класы, тлумачылі тэхніку бяспекі. Дваццаць пяць навучэнцаў не засталіся раўнадушнымі, і цяпер яны чатыры разы на тыдзень пасля ўрокаў увечары бягуць лазіць па сценках пад пільным наглядам дырэктара.

— Цяпер у вучу дзяцей ад чатырох да пятнаццаці гадоў, — тлумачыць яна. — Займаемся боўлдэрынгам. Гэта такі від скалалажання без страхавачных вяровак, дзе маршрут трэба прайсці за некалькі хвілін. Спрабаваць можна неабмежаваную колькасць разоў. Галоўнае — дайсці да крайняй кропкі, топа, за вызначаны час. У нас вышыня сценкі — два метры дзевяноста сантыметраў. Але дзеці не баяцца! Канешне, ёсць рызыка сарвацца, але ўсё заслана гімнастычнымі матамі. Ды і вучні, калі разумеюць, што не могуць вытрымаць, не падаюць, а проста скачуць уніз. Яны ўжо як спецыялісты! Да таго ж і сама я ўнізе стаю для падстрахоўкі.

— Дзе вы навучыліся гэтаму майстэрству?

— Я самавучка, але захапілася скалалажаннем невыпадкова. Яшчэ калі была школьніцай, удзельнічала ў многіх спаборніцтвах. Ды і ў інстытуце гуляла ў валейбол за зборную. Насамрэч, у нас у школе ўвесь калектыў такі — і настаўнікі, і тэхнічны персанал. А фізрук — ну проста ад Бога! Яго выхаванцы паспяхова выступаюць не толькі на раённых, але і на абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах па стральбе. Ён, дарэчы, таксама выкладае адзін з кірункаў скалалажання: на хуткасць...

На першы погляд, скалалажанне не такое цяжкае, як здаецца. Але засвоіць яго ўсё ж можа не кожны. Трэба быць уважлівым, спрытным, умець разважаць і аналізаваць. А яшчэ — быць гатовым да таго, што амаль пасля кожнай трэніроўкі будуць балець мышцы.

Аднак за два гады вучні Турэцкай базавай школы дасягнулі істотнага прагрэсу.

— Часта ездзім у госці ў Мар'іну Горку, на першынство Пухавіцкага раёна, — кажа Антаніна Даўгалявец. — Многаму вучымся менавіта там, у больш вопытных скалалазаў. Пакуль што самы высокі вынік — трэцяе месца ў вобласці. А вось рэспубліканскія спаборніцтвы нам яшчэ цяжка даюцца. Там вельмі складаныя маршруты. Але я ганаруся, калі з сямідзесяці ўдзельнікаў мае дзеткі ўваходзяць у дваццатку найлепшых. Асабліва прыемна, калі бачу «агонь» у іх вачах, жаданне змагацца і перамагаць. Уявіце сабе: зіма, холад, субота, сем раніцы — а мы «ляцім» на маршрутцы ў Мінск, на спаборніцтвы!

Безумоўна, імкнёмся ўдасканальвацца. Для гэтага будуем «цяжкасці» — сценкі з нахілам, розныя зігзагі... Плануем яшчэ шмат цікавага!

Аднак для таго, каб зрабіць штосьці новае, Турэцкай базавай школе, як і ўсім, патрэбны спонсары. Без іх скалалазы не могуць дазволіць сабе многія рэчы. Напрыклад, спецыяльны абутак, які каштуе каля двухсот рублёў. Яго ніхто з дзяцей сабе набыць не можа: дорага. А звычайныя красоўкі не падыходзяць. Таму маленькім скалалазам даводзіцца абуваць паўкеды, на памер меншыя за нагу, каб пальцы былі зусім заціснутыя.

— Мы стараемся дапамагаць сабе самі, — каментуе дырэктар. — У школе стаіць невялікая скарбонка для ахвяраванняў на скаладром. На гэтыя грошы мы купляем спецыяльны парашок — магнезію, — якім дзеці мажуць рукі, каб не саслізгвалі. Мяшэчкі для яе, што трэба мець абавязкова, сшыў тэхнічны персанал. А выезд на спаборніцтвы аплачваюць бацькі...

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка III курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Мець стрыжань*

# Поспехаў, будучы чэмпіён!

**Адзінаццацігадовы Артур ШЫБАНАЎ жыве ў Камянцы. Тыя, хто асабіста не знаёмы з хлопчыкам, дакладна ведаюць яго ў твар: амаль кожны летні дзень ён праводзіў на вуліцы — катаўся на роліках, веласіпедзе, гуляў з сябрамі ў футбол на гарадскім стадыёне.**



Канікулы ўжо даўно скончыліся, і зараз Артур наведвае спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерву «Пушча». Дзюдо займаецца чатыры гады, і варта адзначыць, што гэтае рашэнне ён прымаў самастойна. Яшчэ будучы першакласнікам, Артур выказаў жаданне наведваць спартыўную школу, аднак праз некаторы час расчараваўся і перастаў хадзіць на трэніроўкі. Вяртацца на татамі дзюдаіста-пачаткоўца ніхто не прымушаў, а натхніў яго прыклад стрыечнага брата Андрэя Шыбанава, які наведвае гэтую ж секцыю. «Я захацеў стаць такім, як ён», — кажа Артур. Цяпер у яго скарбонцы нямала грамат з турніраў. Акрамя спаборніцтваў у Камянцы, Ляхавічах, Століне хлопчык можа пахваліцца паездкамі ва Украіну і ў Польшчу.

Трэнер па дзюдо Чыназ Цеміраў ахарактарызаваў свайго падапечнага так: «камунікабельны, працавіты, перспектыўны». Артур, па словах яго настаўніка, валодае стойкасцю, вынослівы, мае той самы ўнутраны стрыжань, які дапамагае спраўляцца як з фізічнымі, так і псіхалагічнымі нагрузкамі. У гутарцы і развагах на тэму выхавання цяперашняга пакалення дзяцей і падлеткаў Чыназ Цеміраў выказаў думку, якая будзе карысная для ўсіх бацькоў.

— Людзі забываюць, наколькі важны рух — ён неабходны, як паветра, — разважае трэнер. — Я гляджу на маладое пакаленне і разумею, што трэба заклікаць бацькоў удзяляць больш увагі выхаванню і фізічнаму развіццю дзяцей. Танцы, барацьба, футбол... Усё, што заўгодна, абы толькі дзіця рухалася! Мама Артура — вялікая разумніца, што разумее гэта.

Захапленні шасцікласніка не абмяжоўваюцца чыста спартыўнымі. Так, Артур вучыцца ў дзіцячай школе мастацтваў: іграе на баяне і трубе. Акрамя музычных талентаў, хлопец валодае і мастацкімі — нядрэнна малюе. Яго карціны выклікаюць сэнсавай завершанасцю, што, у прынцыпе, можна заўважыць ва ўсім, чым займаецца хлопчык: ён заўсёды даводзіць пачатае да канца і ўпарта ідзе да вызначанай мэты. Аднак разам з унутранай цвёрдасцю і мэтанакіраванасцю, ён вельмі добры, таварыскі. Не адмаўляецца Артур і ад простых дзіцячых радасцяў. У вольны ад школы і дадатковай адукацыі час глядзіць тэлевізар і гуляе. Любіць збіраць з дробнага канструктара мадэлі ваеннай тэхнікі: самалёты, караблі — часам «падглядае» ў інтэрнэце больш складаныя прыклады.

На цяперашнім этапе складана сказаць, які шлях абярэ Артур у будучыні, бо дзяцінства — гэта такі час, калі ўсё цікава. Сказаць нешта больш-менш адназначна можна будзе ў 2019 годзе, калі хлопчык увойдзе ў той узрост, што дазволіць яму прымаць удзел у першынствах краіны па дзюдо. Тады, хутчэй за ўсё, падлетку прыйдзецца зрабіць сур'ёзны выбар.

**Ганна СОЎПЕЛЬ. Фота аўтара.**

SEX=БАЛЯСЫ

# ЭФЕКТ БАГАМОЛА

**Каляжанка па цэху і сябра нашай сям'і выклала ў сацыяльных сетках адну са спрэчак з мужам. Вельмі цікавую, на мой погляд, таму я вырашыў, як той казаў, падхапіць тэму. У тым абмеркаванні паміж сужэнцамі інтрыга была ўжо ў першым сказе: «Самка багамола ўчора зрабіла мой вечар». («— Дарагая, я вырашыў, што больш ніколі не буду з табой сварыцца! — Не, вы толькі паглядзіце на яго... Ён вырашыў... А ў мяне ты спытаў?!») Усе ведаюць, што самка багамола адгрызае галаву самцу падчас спароўвання. (Ну, такое не толькі ў гэтых насякомых бывае. «Іду, гляджу, два галубы сядзяць. Адзін другога па галаве — цюк-цюк... Другі натапыраны, але маўчыць, трывае... Муж, мабыць!») І вось, піша каляжанка, прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва ў гэтай сувязі ўпэўненыя, што пазбаўленне часткі цела самца служыць доказам, па-першае, лютасці ўсіх без выключэння самак. («Да жанчыны яго мары яна зусім крыху не дамаўчала...») Па-другое, што ім, прадстаўніцам жаночага полу, толькі гэта і трэба — спароўванне і патомства... («Жанчына створана для таго, каб зрабіць мужчыну шчаслівым. Дзе б гэты няшчасны ні хаваўся...»)**

Гэта была ўводная частка. Калі ў сваёй праекцыі на род чалавечы я крыху «перагнуў планку», дык, пагадзіцеся — зусім крышачку. У многіх у жыцці часам прыкладна так яно і бывае. («Усё, што жанчына даруе, яна табе потым яшчэ прыпомніць».)

Дык вось, каляжанка вычытала ў адным зборніку навукова-папулярных артыкулаў, што (аказваецца!) галавы багамол пазбаўляецца не проста так, а з сэнсам! («Прашу строга не судзіць майго мужа, паколькі ён у мяне пяты, а я ў яго першая».) Справа ў тым, што мозг мужчынскай асобіны падчас «працэсу» пасылае яго рэпрадуктыўнай сістэме сігналы, якія не дапускаюць апладняервання. («Гаворыць, самыя добрыя ў ложку мужчыны — кандуктары. Таму што «кандуктар не спяшаецца, кандуктар разумее...») У сухім астатку мы можам сфармуляваць сутнасць канфлікту паміж жанчынай і мужчынам досыць проста. («Далёка не ўсе людзі хочуць жаніцца. Большасць людзей хоча замуж».) У нас, прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва, звычайна як? («Калі мужчына перастаў галіцца кожны дзень, мяняць шкарпэткі, прабачацца, гаварыць кампліменты, дарыць кветкі... Усё, супакойся, ён твой!») Мы сустрэлі сваю каханую, нам з ёй хораша. («Знайшоў добрае месца ў жыцці — паркуйся!») А ў жанчын што? Вось-вось... («— Дарагі, я ўжо гатовая да дзяцей! — А я не! — Нічога не зробіш. Лета заканчваецца, трэба іх забіраць з вёскі».)


Фота Надзеі БУЖАН.

Іншымі словамі, як толькі самка багамолу галаву чыр-чырык, у таго ўсё і атрымліваецца. Адзін раз, але гарантавана. («— У кожным мужчыне, несумненна, ёсць жалезны стрыжань і слабым жанчынам яго не сагнуць. Застаецца адно — пілаваць».) Мне толькі адно цікава: як самка здагадваецца пра сігналы, што самец сам сабе адпраўляе? («Жонка мужу: «— Ты заўважыў, што я з табой другі дзень не размаўляю? — Цішэй ты, я, можа быць, падаўжаць буду».) І вось тут у спрэчцы паміж сужэнцамі пачынаецца самае цікавае. Сяброўка хоць і аддае даніну павагі геройчна загінуламу багамолу, але апраўдвае такі крок найперш рацыянальнасцю. Так, нашчадкі будуць, гены перададзены. («Ты можаш многае сказаць аб жанчыне па яе руках. Напрыклад, калі яны абхопліваюць тваё горла, значыць, дама, верагодна, злёгку расстроеная».)

Я, натуральна, на баку мужа сяброўкі. Той даводзіў, што ад змены прычыны нічога ў прынцыпе не мяняецца: бедны багамол застаецца без галавы і кропка. («Проста дзіўна, наколькі мужчыне прасцей зразумець жанчыну, калі ён з ёй не жанаты».) Да кансэнсусу сябры так і не прыйшлі, але дыскусія ў іх, як прызналіся, была бурная і вясёлая. («Часцей прыслухоўвайцеся да жартаў. Там часам столькі праўды...») Але ж людзі дарослыя, проста сышліся на тым, што, магчыма, калі-небудзь эвалюцыя давядзе справу да таго, каб у самцоў пасябравалі мозг і рэпрадуктыўная сістэма. Ці ў самкі нешта змянілася? («Часам так хочацца забіць мужа, але нельга. Я за яго перад дзяржавай адказваю. Мне яго ў загсе пад роспіс выдалі».) Гэта яны, нагадаю, пра насякомых.

Я ж вазьму на сябе смеласць падоўжыць пазнавальны дыспут, толькі зноў жа на прыкладзе людзей. Як-ніяк — вышэйшых арганізмаў. Тут апроч інстынктаў і інтэлект павінен прысутнічаць. Але, калі ўдумацца, эфект багамола прысутнічае і ў нас. Праяўляецца толькі па-рознаму. Некаторыя ахвярай становяцца добраахвотна, выбіваючы тым самым для сябе нейкія выгоды. («— Ты падабцаснік! — Я схільны лічыць сябе мужчынам, здольным на разумныя і абгрунтаваныя кампрамісы дзеля сексу і баршчу».) Іншыя самі «прагнуць крыві». («Жанчына павінна выйсці замуж два разы. Адзін раз — для шоку, другі раз — для шыку».) Часта менавіта такія дзве адзіноты і сустракаюцца. («Майстар на ўсе рукі жаніўся з хворай на ўсю галаву. Зараз дурная галава рукам спакою не дае».)

Насамрэч усё прасцей. Трэба сустрэць сапраўды свайго «багамола». І вытрываць пажыць з ім колькі часу. («— Дарагая, давай не будзем сварыцца, а абмяркуем усё спакойна... — Не! Колькі раз, калі мы штосьці спакойна абмяркоўваем, ты маеш рацыю!») Каб стала відавочна, што «адарванне» галавы — аднаразовае задавальненне. Можна ж рабіць гэта ўсё жыццё. Балазе, і хадзіць далёка не трэба... «А жыццё харошае такое, ты ўсміхніся і абдымі...»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Прыпраўляю стравы ўсмешкай»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Мама, праўда, хацела, каб я пайшоў у радыётэхнічны інстытут. Адправіла мяне на экзамены. Першым іспытам была матэматыка: у мяне па ёй заўсёды стаяла «выдатна». Але я разумею: гэта прафесія — не маё. Узяў білет, паставіў прозвішча і варыянт і напісаў: «Дзякуй, але я не хачу ў вас вучыцца». І здаў. Вядома, не паступіў. Шчаслівы забраў дакументы і панёс іх у вучылішча №221 (цяпер Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж кулінарыі. — **Аўт.**). А там кажуць: «Не возьмем — у вас такі добры атэстат». Я вырашыў прыйсці на наступны дзень: ужо сядзела іншая жанчына, і мяне прынялі.

***— Дзе пачыналі сваю кар'еру?***

— На сталовай завода «Белвар-Амкадор». Быў там у якасці практыканта — выконваў работу, якую лянуюцца рабіць усе астатнія *(усміхаецца)*. Напрыклад, развазваў смятану. На наступны год мяне адправілі на практыку ў рэстаран італьянскай кухні, дзе рабілі піцу на дровах. Думаю: крута! Але давялося тры месяцы чысціць кальмараў. Кожны дзень. Мяне так і называлі: чалавек-кальмар. Затое ў канцы другога курса мяне ўзялі туды на аплатную работу і паставілі старшым змены.

**«З часам смакі адкладваюцца ў памяці, ты можаш у галаве іх скласці, як лічбы ў матэматыцы, і зразумець, што атрымаеш на выхадзе».**

***— Вы вучыліся ў кулінарных акадэміях Італіі, Францыі. Што ўразіла падчас замежных стажыровак?***

— Італьянцы мне вельмі падабаюцца сваёй эмацыянальнасцю. Нашым людзям гэтага не хапае: яны як сённяшняе надвор'е (у дзень інтэрв'ю было пахмурна. — **Аўт.**). У Італіі шэф прыходзіць на працу, і ён ужо «гарыць»: на ім можна «смажыць»! На кухні я заўсёды стараюся падняць усім настрой. Трэба будзе — і заспяваю, і станцую, толькі каб калегі ўсміхаліся. Мой калектыў думае, што я нешта куру. А я не куру ўвогуле і сваім кухарам забараняю. Рэцэптары забіваюцца тытунём, і чалавек пасля цыгарэты дзве гадзіны не адчувае смак.

***— Дома кухня — ваша любімае месца?***

— Так. Заўсёды раблю для сям'і сняданак. Але паколькі я працую вельмі шмат (магу прыйсці ў рэстаран у шэсць раніцы і вярнуцца дадому праз тры дні), часцей гатуе жонка. Яна запякае неверагоднага карпа, за якога можна аддаць усе прафесійныя зоркі, што толькі ёсць.


Фота Надзеі БУЖАН.

***— Якія прадукты заўсёды ёсць у халадзільніку шэф-кухара?***

— Масла, малако, якая-небудзь сасіска... Як і ва ўсіх. Фуа-гра я там не трымаю. Затое ляжаць прадукты з уласнага падворка. Я люблю на лецішчы калупацца ў агародзе, разводзіць цікавых птушак — фазанаў, паўлінаў. У мяне там нават ёсць качкі, якія нясуць блакітныя яйкі. Для мяне праца на зямлі — гэта рай. Як сыду на пенсію, паеду за горад.

***— Дарэчы, пра фуа-гра. Часта гатуеце дома нейкія далікатэсы?***

— Не, мая сям'я такое не есць. Дзіця, як і ўсе, абажае макароны. У гэтыя выхадныя я, напрыклад, рабіў лазанню ў печы. Люблю купляць тэхніку для гатоўкі — нядаўна прывёз з Італіі скараварку. А вось апаратам — той жа хлебапечцы — не давяраю, калі шчыра. Цеста замешваю толькі рукамі.

***— Як нараджаюцца рэцэпты?***

— Проста «бум» — і ўсё. За дзень 50 рэцэптаў магу прыдумаць. У Італіі мы вучыліся з закрытымі вачыма распазнаваць, што каштуем. З часам смакі адкладваюцца ў памяці, ты можаш у галаве іх скласці, як лічбы ў матэматыцы, і зразумець, што атрымаеш на выхадзе. Ужо не трэба стаяць каля пліты і пераводзіць прадукты, каб знайсці найлепшае спалучэнне.

***— Верыце ў нейкія прыкметы на кухні?***

— Толькі ў адну: калі ў зале няма гасцей, то да кухара пытанні *(смяецца)*. Я за тое, каб былі сумленныя цэны. Таму ва ўсіх рэстаранах, дзе працую, цэны стаўлю сам. Я ведаю сабекошт прадуктаў і тое, колькі за страву можа аддаць звычайны беларус.

***— Чытала, што вы ездзілі ў экспедыцыю па краіне ў пошуках старажытных рэцэптаў. Што цікавага даведаліся?***

— Я толькі пацвердзіў сваю думку аб тым, што наша кухня ўвабрала ў сябе еўрапейскія традыцыі. Раней жа кулінараў таксама любілі прывозіць з Захаду, бо там культура ежы была вышэйшая. У Брэсцкай вобласці, напрыклад, некалі гатавалі лазанку. Як лазання, толькі замест пасты — бліны. Перакладалі іх тушаным мясам, пасыпалі дамашнім сырам і ставілі ў печ. Чаму многія рэцэпты забытыя? Напэўна, таму, што нашы людзі не лічаць сваю культуру цікавай. А я люблю Беларусь і не хачу нікуды адсюль з'язджаць. З падарожжаў заўсёды цягне дадому.

***— Ці змяніліся гастранамічныя густы беларусаў за апошні час?***

— Вядома, людзі сталі больш разбірацца ў кухні, метадах прыгатавання страў. Хоць некалькі гадоў назад ездзіў у рэгіён і зайшоў у рэстаран гасцініцы. Заказаў стэйк з ялавічыны, прасмажаны сярэдне, а лепш слаба. Чакаю 40 хвілін. Прыносяць мне мяса такое сухое, што ім цвікі забіваць можна. Кажу: «Я ж вас прасіў не моцна прасмажваць». На што пачуў: «Малады чалавек, мяса з крывёй есці нельга».

***— Чабурэк рызыкняце купіць на вакзале?***

— Не. А вось у чабурэчнай каля чыгуначнага вакзала — так. Я некалі ў кавярні непадалёк працаваў, і ў нас раз на месяц быў сандзень. Кухарам на пару гадзін трэба было пакінуць памяшканне, і мы хадзілі ў гэтую чабурэчную: напэўна, рабілі ім план на тыдзень. Унутры там, праўда, быццам вярнуўся ў 1980-я. Але чабурэкі — проста «бомба».

***— Як дабавіць іскрынку ў страву?***

— Самая галоўная іскрынка — ваша душа. Кроплю ўсмешкі дадайце, і ўсё атрымаецца. Гэта насамрэч так. Калі будзеш гатаваць з кепскім настроем, у цябе і ежа будзе нясмачная.

***— Чаму шэф-кухарамі часцей становяцца мужчыны?***

— Таму што гэта цяжкая праца. Увесь дзень на нагах. У мяне крокамер уключаны: цяпер пяць гадзін вечара, а я, толькі па рабоце, нахадзіў 7650 крокаў. І яшчэ не хутка паеду дадому. Патрэбна таксама маральная стойкасць, а дзяўчаты больш ранімыя.

***— Як са звычайнага кухара стаць шэфам?***

— *(Задумваецца)* Напэўна, любіць сваю справу. Я нават не магу назваць гэта работай — гэта хобі. Ведаеце, у мяне ёсць кабінет на мінус першым паверсе, дзе вялікая бібліятэка (кажу, што для кухараў, а насамрэч кніжкі проста дома не змяшчаюцца) і мільярд папер. Стараюся хутчэй з дакументамі разабрацца і бягу на кухню. Найвышэйшая ўзнагарода для мяне — любоў гасцей. Я гатовы змяніць страву, каб чалавек застаўся задаволены і вярнуўся ў рэстаран яшчэ раз.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 25.10.2017 г.

■ Старонкі гісторыі

# НА ПАШТАМЦЕ ЛЮБІЛІ ПРЫЗНАЧАЦЬ СПАТКАННІ

**Пра будаўніцтва галоўнага аддзялення сувязі сталіцы, укараненне першых касавых апаратаў і паношанае адзенне ў пасылках**

**Штодзень на Галоўпаштамце абслугоўваюць да дзесяці тысяч чалавек. За суткі тут прымаецца каля тысячы пасылак і трох тысяч лістоў. А некалі ў гэтых сценах гучаў стук малатка, дыктаваліся віншавальныя тэлеграмы і завязваліся гарадскія раманы...**


Аперацыйная зала. Працоўнае месца па выдачы карэспандэнцыі «да запатрабавання». 1956 г.

## РУЧНАЯ РАБОТА

Праектаваць Галоўпаштамт пачалі ў 1947 годзе. Работу даручылі Уладзіміру Каралю — намесніку начальніка ўпраўлення па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР. Дапамагаў яму малады выпускнік Маскоўскага архітэктурнага інстытута Абрам Духан. Мінскі паштамт узводзіўся, можна сказаць, уручную: без кранаў і спецыяльнай тэхнікі, толькі намаганнямі рабочых.

Гэта быў адзін з першых новых будынкаў, што з'явіліся ў разбуранай сталіцы пасля Вялікай Айчыннай вайны. Цікава, што Мінгарвыканкам і гасцініца «Мінск», якія праектаваліся пазней, не маглі быць вышэйшыя за паштамт.

28 мая 1955 года адбылося ўрачыстае адкрыццё. А ўнікальны гадзіннік над уваходам з'явіўся ў маі 1961 года. Яго называюць «гадзіннікам свету», бо ён паказвае час у дзясятках гарадоў — Берліне, Токіа, Парыжы, Баку. За ўсю гісторыю ён ні разу не спыняўся. Раней, дарэчы, у пачатку кожнай гадзіны гучала вядомая мелодыя «Радзіма мая дарагая». Ігралася яна на звычайнай гітары: да струнаў былі прымацаваны малаточкі, якія злучаліся з гадзіннікам, і гук узмацняўся праз дынамікі. Замаўчаў гадзіннік у пачатку 1970-х, калі выйшаў указ аб забароне ў гарадах лішніх гукаў.

Інтэр'ер паштамта ўпрыгожваюць вітражы. Яны былі зроблены да Алімпіяды ў 1980 годзе і на той час лічыліся раскошай. У кожным акне — помнік беларускай архітэктуры (Сафійскі сабор у Полацку, Камянецкая вежа, ратуша ў Віцебску). Выявы на вітражах ахопліваюць вялікі перыяд часу — з XI па XVIII стагоддзе. У круглай зале вісіць жырандоля, выкананая па спецзаказе Міністэрства сувязі СССР, вагой амаль паўтоны. А ў цэнтральнай устаноўлены знак, які паказвае адлегласць да гарадоў Беларусі і Еўропы.

## ТЭЛЕГРАМЫ І МЯХІ СА СПАДЧЫНАЙ

— У пасылачнай зале заўсёды стаяў пах клею, сургучу і чуўся стук малаткоў, — успамінае работу на Галоўпаштамце **Тацццяна ГУЗЯНКОВА, цяперашняя супрацоўніца гісторыка-інфармацыйнага цэнтра «Белпошты».**

У прафесіі жанчына ўжо 45 гадоў. Усміхаецца, што ў яе і выбару не было: мама працавала на пошце. Дома заўсёды было шмат газет — маленькая Таня любіла перапісваць адтуль літары і так у пяць гадоў навучылася чытаць. Дапамагала маме разносіць прэсу па суседзях. Натуральна, за гэта была ўзнагарода: хто грушу дасць, хто яблычак. А ў школе дзяўчынка ўжо рабіла падпіску на «Зорку» і «Піянера Беларусі».

У 17 гадоў (у 1972-м), паралельна з вучобай на вячэрнім факультэце Інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышава (цяперашні БДЭУ), Тацццяна Аркадзеўна пайшла працаваць вучнем аператара сувязі ў аддзяленне №83 сталіцы. Пасля была начальнікам 114-га аддзялення, а ў 1980-х перавялася на паштамт — яе выбралі старшыней прафсаюзнага камітэта прадпрыемства.

— Як і ўсюды ў сферы абслугоўвання, у нас працавалі пераважна жанчыны — 97 працэнтаў калектыву, — кажа Тацццяна Гузянкова.

Фірмавае адзенне ў апаратараў сувязі ўзнікла ў 1980 годзе: пашылі спецыяльна да Алімпіяды (сёння яго, дарэчы, можна ўбачыць у музеі пошты). А дагэтуль супрацоўнікі атрымлівалі звычайныя халаты.

Памятае Тацццяна Аркадзеўна і як пошта пераходзіла на новую тэхніку. Замест квітанцый, якія пісаліся ўручную, — касавы апарат «КІМ» (на ім выконваліся простыя аперацыі для прыёму падпіскі і тэлеграм), электрамеханічная машына «Анега».

«З такой цяжкасцю яны ўкараняліся, — дзеліцца суразмоўніца. — Прыходзілася весці тлумачальную работу і ўласным прыкладам паказваць, як гэта зручна і добра. Не трэба сляпіцца і разбірацца — 1, 4 ці 7 напісана ў квітанцыі».

Тэлеграм у 1980-я гады слалі вельмі шмат. У асноўным віншавальных, але сустракаліся і сумныя — з паведамленнем аб смерці блізкіх. Пасылак таксама было многа. З Беларусі адпраўлялі адзенне, дзіцячы абутак. З Украіны да нас часта ішлі семкі і арэхі, а з Еўропы ў вялікіх мяхах дасылалі рэчы, якія засталіся ў спадчыну ад кагосьці са сваякоў, што жылі ў эміграцыі.

— Усе думалі, што мы тут вельмі дрэнна жывём, і адпраўлялі паношанае адзенне, абутак. Была неяк прэтэнзія: жанчына з Бабруйска атрымала пасылку з Ізраіля і заявіла, што яе падмянілі. Пачалі разбірацца. Пошта прыйшла ў добрым стане, распакавана не была, вага адпавядала. Але жанчына не магла паверыць, што ёй прыслалі з Ізраіля калінінградскія шпроты, грэчку і гарох нашай вытворчасці. Аказалася, калі яе сваякі з'язджалі туды на пастаяннае месца жыхарства, бралі з сабой усё, што толькі можна. Прадуктаў таксама назапасілі. А ў іх жа тэрміны прыдатнасці не вечныя. Вось і адправілі землякам: лічылі, у нас голад.

**Унікальны гадзіннік над уваходам з'явіўся ў маі 1961 года. Яго называюць «гадзіннікам свету», бо ён паказвае час у дзясятках гарадоў — Берліне, Токіа, Парыжы, Баку.**

Скрыні для пасылак тады былі толькі драўляныя. На касах у спецыяльных каробачках ляжалі маленькія цвікі: кліенту ці аператару прыходзілася самастойна іх забіваць (малаток таксама выдавалі). Потым скрыні туга перавязвалі льняным шпагатам. На канцы ніці накладаўся плаўлены сургуч і ставілся адбітак страхавой пячаткі. За змену аператар прымаў да ста такіх пасылак.

А яшчэ паштамт быў улюбёным месцам закаханых: тут часта прызначалі спатканні.


З архіва.

Вядома, цяпер тэхніка зусім іншая. Патокі людзей рэгулюе электронная чарга, грошы за «камуналку» прымае плацежна-даведачны тэрмінал. Але што захоўваецца — гэта высокія стандарты абслугоўвання, заўважае Тацццяна Аркадзеўна:

— Я заўсёды кажу, што наведвальніка трэба прымаць так, быццам ён прыйшоў на пошту ўпершыню і не ведае, што такое бандэроль і дробны пакет. Варта расказаць аб усіх відах паслуг, якія цікавяць чалавека, назваць кошты, каб ён мог выбраць. Тады кліенты будуць вяртацца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Гэта цікава

# Ці можна заказаць марку са сваім партрэтам?

**Пра тое, колькі паштовых мініяцюр выпускаецца ў год, як выбіраецца для іх тэматыка і што з іх карыстаецца найбольшай папулярнасцю ў калекцыянераў, расказалі ў выдавецкім цэнтры «Марка» Белпошты.**

Выключнае права на выпуск і абарачэнне марак у нашай краіне належыць Міністэрству сувязі і інфарматызацыі. Менавіта сюды паступаюць ідэі наконт тэматыкі будучых мініяцюр. Прапановы збіраюць ад дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый і прыватных асоб. Тэматычныя планы фарміруюцца на год-два наперад. Цяпер, напрыклад, ужо зацверджаны планы на выданне знакаў паштовай аплаты на 2018 год.

Як выяўляюць самыя значныя і вартыя прапановы? У мастацкага савета пры Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі ёсць цэлы спіс крытэрыяў. Напрыклад, круглая дата, якой прысвечана марка, мусіць быць кратнай 25. Так, сёлета выйшлі маркі з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, 125-годдзя з часу ўводу ў эксплуатацыю мінскай конкі. Могуць быць таксама адлюстраваны выбітныя дзеячы і знамянальныя падзеі. Сюжэты старанна вывяраюцца на гістарычную адпаведнасць спецыялістамі ў галіне культуры, гісторыі і архітэктуры.

Прыкладна трэць мініяцюр выпускаюць на тэму флоры і фаўны. Бо, па-першае, такія маркі папулярныя ў філатэлістаў усяго свету: серыі з дзікімі і свойскімі жывёламі, рыбамі, птушкамі, грыбамі добра раскупляюцца. Па-другое, беларуская прырода сапраўды багатая і прыгожая. Шырока прадстаўлена на паштовых мініяцюрах тэма запаведных тэрыторый. У розныя гады былі паказаны Бярэзінскі біясферны запаведнік, Белавежская і Налібоцкая пушчы, нацыянальныя паркі «Прыпяцкі», «Нарачанскі», «Браслаўскія азёры».

У цэлым маркі стараюцца рабіць прывабныя і багатыя па змесце. Штогод выдаецца каля 40 сюжэтаў беларускіх мастацкіх паштовых мініяцюр. Спецыфіка філатэлістычнага рынку патрабуе пастаянных маркетынгавых даследаванняў. Без гэтага немагчыма прадказаць камерцыйны поспех таго ці іншага сюжэта. Тыражы выпускаў вагаюцца ад 40 да 80 тысяч экзэмпляраў: іх стараюцца аптымальна сфарміраваць, каб не было дэфіцыту ці лішніх астаткаў.

А ці можна аплаціць выпуск серыі ў свой гонар, з уласным партрэтам? У выдавецкім цэнтры даюць катэгарычны адказ: не. Паколькі маркі, апроч таго што з'яўляюцца прадметам калекцыянавання, служаць у якасці аплаты паштовых збораў. Па сутнасці, каштоўныя паперы. Хоць у некаторых краінах і можна заказаць персаналізаваныя мініяцюры (якія пры гэтым будуць мець рэальную сілу: імі можна аплачваць дастаўку, праўда, у філатэлістычных каталогах гэтыя маркі ўлічваюцца ў чыстым выглядзе, без выяў). Гэта даступна ў Аўстрыі, Францыі, Германіі, Нідэрландах, Канадзе.

Беларусь, дарэчы, актыўна ўдзельнічае ў посткросінгу. Па колькасці зарэгістраваных карыстальнікаў і адпраўленняў наша краіна займае шостае месца ў сусветным рэйтынгу.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Філатэліст

# Першым праваслаўным храмам прысвячаецца

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь сёння, 26 кастрычніка, выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Беларуская праваслаўная царква. 1025-годдзе Полацкай епархіі», якая вядзе сваю гісторыю ад заснавання першай на Белай Русі епіскапскай кафедры.**



Летапіснае ўпамінанне аб першым праваслаўным полацкім храме — Прасвятой Багародзіцы — датуецца 1007 годам. У сярэдзіне XI стагоддзя ў Полацку быў узведзены чацвёрты ў хрысціянскім свеце Сафійскі сабор, адкуль пачала свой праведны шлях праўнучка князя Уладзіміра князёўна Прадслава — святая прападобная Ефрасіння, ігуменн Полацкая.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Беларускай праваслаўнай царквой і Мінскай духоўнай акадэміяй імя святціеля Кірылы Тураўскага.

Мастак Тацццяна Дольская, дызайн Яўгеніі Бядонік.

У дзень выпуску паштовага блока ў аддзяленні паштовай сувязі №15 горада Полацка праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень»

■ Чулі?



## РАСПАЧАЛІСЯ КІРМАШЫ-ПРОДАЖЫ НАВАГОДНІХ ПАШТОВАК

Да Новага года і Каляд выдавецкі цэнтр «Марка» Белпошты распрацаваў новыя святочныя сюжэты паштовак, картак для посткросінгу, канвертаў і марак. Прадукцыя выдаецца на беларускай і рускай мовах. Набыць навагоднія паштоўкі можна ў інтэрнэт-краме shop.belpost.by, у круглай і пасылачнай залах сталічнага паштамта, у спецыялізаванай краме «Філатэлія», а таксама ва ўсіх буйных аддзяленнях сувязі краіны.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 10 ноября 2017 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80% по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20%) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20%) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль ГАЗ-2705-410**, инв. №51317, 2002 года выпуска, **рег. №ЕВ 6993**, тип ТС – грузовой специальный фургон, цвет – синий с белой полосой, объем двигателя – 2,0 л, бензин, состояние – неудовлетворительное. Местонахождение: **г. Рогачев, ул. Ленина, 49А.** | **237,87** | 23,79 |
| 2 | **Автомобиль ГАЗ 2705-410**, инв. №504010021, 2008 года выпуска, **рег. №АЕ 7380-3**, тип ТС – грузопассажирский вагон, цвет – бледно-красный, бензин, состояние – удовлетворительное. Местонахождение: **г. п. Октябрьский, ул. Дзержинского, 45.** | **480,66** | 48,07 |
| 3 | **Автомобиль УАЗ-39099-4**, инв. №504010023, 2007 года выпуска, **рег. №АВ 3103-3**, тип ТС – грузопассажирский фургон, цвет – голубой, состояние – неудовлетворительное. Местонахождение: **г. Чечерск, ул. Советская, 17.** | **238,81** | 23,88 |

**Продавец:** РУП «Белпочта» Гомельский филиал, г. Гомель, ул. Советская, 8. Конт. тел. 8 (0232) 79-68-24 – Старовойтов С. В. (ведущий инженер ГМТО). **Шаг аукционных торгов – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (РУП «Белпочта» Гомельский филиал):** Р/с BY 35AKBB30120210200543100000 в ЦБУ №305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21302,УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);
**2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 октября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 8 ноября 2017 г. в 16.00.**
**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в течение **5 (пяти) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская нива» («Сельская газета») №64 (20896) от 08.06.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8(029)126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

**Предмет торгов**

**Объект №1** – объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-38675 пл. 1001,6 кв. м (назначение: здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование: ателье химчистки), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004400 площадью 0,2020 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 64.
**Объект №2** – объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-11371 пл. 44,6 кв. м (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад ГСМ), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004400 площадью 0,2020 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 64/2.
Составные части и принадлежности: забор железобетонный, ворота, калитка.
**Объект №3** – объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-42981 пл. 136,2 кв. м (назначение: здание специализированное энергетики, наименование: котельная), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004400 площадью 0,2020 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 64.
**Объект №4** – сооружение: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-66251 протяженностью 30,7 п. м (назначение: здание специализированное коммунального хозяйства, наименование: водовод (водопроводная сеть)), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004400 площадью 0,2020 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 64.
**Объект №5** – сооружение: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-66250 протяженностью 84,7 п. м (назначение: здание специализированное коммунального хозяйства, наименование: канализация хозфекальная), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004400 площадью 0,2020 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 64.
Составные части и принадлежности: пять колодцев, камер; пять трубопроводов безнапорных; три выпуска, ливнеотвода.
**Объект №6** – сооружение: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-66252 (назначение: здание специализированное энергетики, наименование: линия электропередачи 0,4 кВ), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004400 площадью 0,2020 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 64.
Составные части и принадлежности: два силовых кабеля

| | |
|---|---|
| **Начальная цена без НДС –** 534 911,00 белорусских рублей | **Размер задатка –** 53 491,10 белорусских рублей |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ЧП «Джерза» |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 BIC Банка BPSBBY2X УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 10 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52, 8 (029) 721-15-65**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 9 ноября 2017 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90

**Лот №1**. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 29,7 кв. м (в т. ч. 18,3; 11,4 кв. м), расположенных на 3 этаже капитального строения с инв. №200/С-53951 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Советская, 13 (здание отделения почтовой связи – 26) для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 112,86 руб. **Задаток:** 12,29 руб.

**Лот №2**. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 9,2 кв. м, расположенного на 1 этаже капитального строения с инв. №200/С-53951 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Советская, 13 (здание отделения почтовой связи – 26) для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 34,96 руб. **Задаток:** 3,50 руб.

**Лот №3**. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 23,2 кв. м, расположенного на 3 этаже капитального строения с инв. №200/С-53951 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Советская, 13 (здание отделения почтовой связи – 26) для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 88,16 руб. **Задаток:** 8,50 руб.

**Лот №4**. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 19,54 кв. м (в т. ч. 18,44; 0,27; 0,83 кв. м), расположенных на 3 этаже капитального строения с инв. №240/С-18515 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, д. 46 (здание специализированное связи) для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 74,25 руб. **Задаток:** 7,43 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 27.11.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».
**Срок внесения задатка и подачи документов:** с 26.10.2017 с 8.30. по 24.11.2017 до 17.30.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, представить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона, отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Конт. тел. (0212) 47-20-56, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Жабинка Брестской области

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 1 | 122550100001002613 | 0,1433 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 99 | **4 931,99** | 980,00 | 561,54 | водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади |
| 2 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 3 | 122550100001002614 | 0,1383 | | 99 | **4 759,91** | 950,00 | 562,05 | водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади |
| 3 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 5 | 122550100001002615 | 0,1425 | | 99 | **4 904,46** | 980,00 | 539,99 | водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади |

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.**
**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, – **2 300,00 рублей**

Земельный участок предоставляется победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:
– в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победителем такого аукциона или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся единственным участником несостоявшегося аукциона:
– внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка путем перечисления на расчетный счет фин. отдела исполкома;
– возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, а также затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;
– не позднее двух рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка и возмещения затрат заключить с исполнительным комитетом в установленном порядке договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в Жабинковское бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
– получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в трехмесячный срок со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на земельный участок в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство объекта;
– занятия (освоения) победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта;
– снятия победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования его для благоустройства участка;
дополнительно по лотам №№5–6:
– получить в установленном порядке АПЗ и тех. условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проектную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
– приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта и осуществить строительство объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией

**Аукцион состоится 30 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).**
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 **26.10.2017 г.** до 17.30 **24.11.2017 г.** (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by и www.gki.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. п. Ушачи Витебской области, ул. Дзержинского

**Продавец: Ушачский районный исполнительный комитет**

